НАША НІВА

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у панядзелкі. №25 (146) 4 КАСТРЫЧНІКА 1999г.

300.000 работнікаў падпісаліся супраць дэкрэту аб дысцыпліне

Уражаньні зь мітынгу рабочых 30 верасьня *на с.2.*

Менскі СКА прабіваецца ў Лігу Чэмпіёнаў. СКА—«Прата» (Італія) 23:21.

Падрабязнасьці на с.4.

Споўнілася 150 гадоў з часу сьмерці Эдгара Алана По, наркамана, алькаголіка, вар'ята і геніяльнага пісьменьніка, які ў 1830 годзе хацеў прыехаць у наш край, каб змагацца на баку паўстанцаў супраць расейскіх акупантаў.

Старонкі 10 і 11.

зь Беларусі за суботу й нядзелю

За Ганчарыхай сочаць

Зінаіда Ганчар зьвярнулася з адкрытым лістом да старшыні КГБ Уладзімера Мацкевіча. Яна піша, што апошні час за яе домам сочаць невядомыя ёй асобы. Ля пад'езду ўвесь час дзяжураць аўтамабілі, а за наведнікамі на пару гадзінаў чапляецца «хвост». Ганчарова жонка называе гэтыя дзеяньні нахабнымі і цынічнымі. Калі гэта КГБ такім займаецца, дык ганьба вам, піша яна. А 3 кастрычніка, калі сачыць не перасталі, жанчына зьвярнулася зь лістом у «Міжнародную амністыю» і да старшыні АБСЭ, міністра замежных справаў Нарвэгіі Волебэка. Яна таксама крытыкуе ў сувязі з гэтым кіраўнікоў Кансультацыйнай групы АБСЭ, кажа, што яны ня выступілі нават з заявай пра зьнікненьне людзей у Беларусі ды дэзінфармуюць кіраўнікоў Эўропы, што тут нібыта ўсё ў парадку, а 29 верасьня нават запатрабавалі ад апазыцыі, каб яна зьняла папярэдняе патрабаваньне да Лукашэнкі вызваліць палітвязьняў.

Сойм піша Пазьняку

У нядзелю засядаў Сойм БНФ. Крытыкавалі правядзеньне зьезду КХПБНФ, шукалі выйсьця з сытуацыі, бо баяцца, што цяпер Мінюст і тых, і тых адмовіцца рэгістраваць. Напісалі ліст да Пазьняка, у якім прапануюць, каб разам прынялі рашэньне разглядаць 4-ы зьезд партыі БНФ як папярэдні да 6-га зьезду руху БНФ.

Някляеў і «Кантынэнт»

У Варшаве эмігрант Уладзімер Някляеў ледзь не сарваў прэзэнтацыю, прысьвечаную 25-годзьдзю слыннага расейскага эмігранцкага часопіса «Континент». На ёй прысутнічалі рэдактары выданьня, расейская дыяспара ў Польшчы й маскоўская прафэсарка-эканамістка Піяшава. Піяшава казала, што ўсё ж рэжым Ельцына — адзіная надзея расейцаў на дэмакратыю. На пытаньне публіцыста Букчына: «Які ж ён дэмакратычны, калі аб'ядноўваецца з дыктатарам Лукашэнкам?» — расейцы заявілі, што ў гэтай інтэграцыі няма нічога «гадкага», што выклікала бурную рэакцыю Някляева й прысутных беларусаў. Замест прэзэнтацыі ў выніку 2 гадзіны дыскутавалі пра Беларусь і каляніялізм. Някляеў назваў «Континент» часопісам, прагнозы якога ніколі не збываліся.

Як нам вядома, сам Някляеў цяпер раздумвае, ці заставацца на эміграцыі, ці вяртацца ў Беларусь.

Герыятры

У кожным раёне Беларусі ўлады хочуць да канца году завесьці па доктары-герыятры, а ва ўсіх абласьцях — адкрыць геранталягічныя цэнтры, піша БелаПАН. Так адзначаюць год прыстарых людзей, якіх у Беларусі 2 мільёны. Вось дзе толькі дактароў возьмуць, калі й пэдыятраў паўсюль бракуе?

Эўропа і ЗША засьцерагаюць Маскву: сьвет не дапусьціць вынішчэньня чачэнцаў

Пагроза гуманітарнай катастрофы на Каўказе

Генэрал Лебедзь: «Тэракты ў Маскве арганізавалі не чачэнцы, а Крэмль»

Расейскія войскі ўвайшлі ў Чачэнію. Падстава — стварэньне на тэрыторыі краіны санітарнага буфэру. Аднак расейскае міністэрства абароны ня выключыла, што «Грозны будзе ўзяты». Пра гэта сьведчыць і колькасьць бронетэхнікі ў кантынгенце — за 1000 адзінак. Хасаўюртаўскія пагадненьні больш нічога ня значаць. Ля пунктаў, населеных чачэнцамі, адбываюцца лякальныя сутычкі. Расейскія войскі не падаюць пакуль ніякай інфармацыі пра свае страты. Сілы абароны Ічкеры гуртуюцца ля стратэгічных для маладой краіны пунктаў. Чачэнскае грамадзтва зьядноўваецца: Масхадаў быццам бы прызначыў Басаева кіраваць усходнім фронтам абароны.

Расейская авіяцыя штодня робіць ад 20 да 50 вылетаў. Колькасьць ахвяраў паветранай вайны дасягнула 600 чалавек, параненых ужо больш за 1000.

Учора ІТАР-ТАСС перадало, што «на Ботліхскім кірунку на тэрыторыі Чачэніі артылерыйскім агнём зьнішчылі 18 аўтамабіляў, у тым 5 грузавых, што належалі баевікам, забітыя 30 чачэнскіх экстрэмістаў». Але, паколькі ідзецца пра легкавікі й грузавікі і падзеі адбываліся на мяжы Чачэніі й Дагестану, расейскія праваабаронцы баяцца, што ўдары наносіліся па караванах з уцекачамі.

Прадстаўнікі расейскага праваабарончага цэнтру «Мэмарыял» на чале з нашым суайчыньнікам Сяргеем Кавалёвым 10 дзён правялі ў Дагестане. Сьведчаньні жудасныя: яны назіралі гвалт і рабаваньні дамоў чачэнцаў-акінцаў пад выглядам змаганьня з баевікамі. Кіраўнік «Мэмарыялу» Алег Арлоў кажа, што ў некаторых паселішчах ім даводзілася трапляць на шчэ дымныя папялішчы на месцы дамоў, у якіх жылі акінцы. Дакладнай колькасьці ахвяраў у Карамахах, Чабанмахах і іншых паўстанскіх аулах пакуль ніхто ня ведае.

Фота AP

Чачэнскія уцекачы на дарозе ў Інгушэцію

Колькасьць уцекачоў з Чачэніі перавысіла 100 тысяч, дагестанскіх пакуль падлічыць немагчыма. Прымае іх толькі братняя чачэнцам Інгушэція. Яны стаяць табарам проста ля шашы.

Працяг і камэнтар да падзеяў — на с.5.

Літаратурны нобэль '99

Нобэлеўскую прэмію ў літаратуры атрымаў сёлета Гюнтэр Грас

Лявак, як і пазалеташні ляўрэат Дар'ё Фо. Галоўным канкурэнтам Граса быў «новы правы» Мілан Кундэра. У змаганьні сыстэмаў на гэты раз перамог сацыялізм. Абодва пісьменьнікі — з Цэнтральнай Эўропы. Кундэра — чэх, Грас — з Данцыгу (Гданьску, нар. у 1927). Менавіта раман зь ягонай «Данцыгскай трылёгіі» — «Бляшаны барабан» — найлепш зразумелі чытачы й гледачы. На экраны яго перанёс Шлёндарф.

Грас належаў да «Групы 47», да постнацысцкага пакаленьня, зьнявечанага, спаскуджанага нацызмам. У гісторыі думкі й мастацтва ён застанецца побач зь Бёлем (менавіта яго згадаў Грас, даведаўшыся пра ўзнагароду: «Бёль быў бы ўсьцешаны»), Фасбіндэрам, Шлёндарфам, Герцагам, фон Тротай... Радыкальнейшы за іх і скандальны (ён хадзіў па Заходнім Бэрліне й прадаваў з рук орган гэдээраўскай САПН «Ноес Дойчлянд»), маладзейшы (дажыў да краху камунізму і Бэрлінскай сьцяны), большы нігіліст (ён выкрывае і зьдзекуецца з дарослага сьвету і ягоных вартасьцяў, але не знаходзіць прытулку і ў дзіцячым сьвеце, дзе яго таксама паглынае страх, нянавісьць, злосьць).

Фота AP

Рыхтар Грас

Сёй-той абвінавачваў Граса й ягоных сяброў у тым, што гэта яны стварылі ў немцаў комплекс віны і самі жылі з гэтага комплексу. А цяпер гэты комплекс замінае немцам адчуць сябе паўнавартаснай нацыяй. Апошнія гады Гюнтэр Грас ня мог выйсьці з фрустрацыі, выкліканай падзеньнем камунізму: ён з падвойным жарам выкрываў і засьцерагаў ад адчужэньня, якое нясе з сабою тэхнагенная капіталістычная цывілізацыя.

Данцыг-Гданьск Грасавай маладосьці быў вольным горадам. Такіх у Эўропе ўсяго два: ён і Р'ека (Ф'юмэ) на Адрыятыцы. Паўночны край Сярэдняй Эўропы. Горад германскай культуры, горад ганзейскі, населены жыдамі, немцамі й палякамі. Такіх асяродкаў нідзе ў сьвеце больш няма, апроч нашых краёў: яшчэ Вільня, Львоў, Трыест, Прага, Чарнаўцы. Гэтыя гарады й далі Эўропе найбольш вялікіх пісьменьнікаў.

На беларускую мову нічога істотнага з Граса не перакладзена, мо праз тое, што Грасаў стыль ня любіць патрыярх перакладу зь нямецкае Васіль Сёмуха. Можа, Грасава цынічная й грубаватая, хоць і сакавітая мова, і не далася б для беларускага перакладу.

Кандыдатура Васіля Быкава, вылучанага Беларускім ПЭН-Цэнтрам, не разглядалася.

Барыс Тумар

Фота IREX-ProMedia.

Валеры Шчукін нясе чырвоны і бела-чырвона-белы сьцягі на шэсьці на Дзень Волі

Інтэрвію з Валер'ем Шчукіным — на с.3.

Знакам тым

НАЗАВІ ЯГО НАЦЫЯЙ

Вольга КАРАТКЕВІЧ

Кажуць, што выкладчыца філфаку БДУ Люба Тарасюк пад час іспытаў па бел. літ. вывешвала на дзьвярах надпіс «Выраз «просты беларускі народ» — забаронены». Беларускі народ не заўжды просты, а ступень простасьці залежыць ад долі дамешку крыві — расейскай, польскай, татарскай, жыдоўскай. Часам здаецца, што дзеці міжнацыянальных шлюбаў больш за чыстых беларусаў дбаюць пра культуру гэтай зямлі і хочуць захаваць краіну.

Працяг нататак — на старонцы 2.

лісты ў рэдакцыю

Пастка для грамадзянскай супольнасьці

Увесь год грамадзяне, аб'яднаныя ў прафсаюзы, грамадзкія арганізацыі, даказваюць, што яны існуюць — што ў сапраўднасьці аб'яднаныя ў арганізацыі, што колькасьць сяброў у пярвічных структурах гэтых арганізацыяў адпавядае патрабаваньням дэкрэту №2. Калі ж кіраўнікі грамадзкіх арганізацыяў ня выканаюць усіх патрабаваньняў, то іх грамадзкая дзейнасьць будзе па-за межамі закону. Працэсам перарэгістрацыі кіруе спэцкамісія на чале з У.Замяталіным, і рашэньні камісіі не падлягаюць абскарджваньню ні ў якой судовай інстанцыі. Спэцкамісія проста выдае рэкамэндацыі для Мінюсту. Менавіта яна вырашае, адмовіць у рэгістрацыі ці не адмаўляць.

Але адмова ў рэгістрацыі падасца дробязьзю ў параўнаньні з тым, калі «генэралы» грамадзкіх арганізацыяў застануцца без «салдатаў» — нізавых структураў. Менавіта на гэта накіравана бюракратычная машына: паставіць базавыя структуры на мяжу закрыцьця. Дзеля гэтага падрыхтавана пастка пад назвай «юрыдычны адрас», безь якога рэгіянальную структуру не паставяць на ўлік ва ўпраўленьні юстыцыі і ў райвыканкаме. Да дэкрэту было паэўрапейску проста: чалец арганізацыі прадстаўляў сваю хату пад юрадрас, зьвяраючы свой подпіс ва ўладальніка жыльля, — і праблема здымалася. Але цяпер, у адпаведнасьці з Жыльлёвым кодэксам, уведзеным з 1 ліпеня (вось дзе расстаўлена пастка), уладальнікі жыльля ня маюць права гэта зрабіць — глядзіце арт. 8 ЖК.

Цяпер кожны кіраўнік павінен знайсьці ўстанову, якая мае памяшканьне, гатовая прадставіць яго для сходаў і іншай статутнай дзейнасьці арганізацыі, а таксама пад юрыдычны адрас.

Калі праблема з юрадрасамі ня будзе зьнятая, то адназначна гэта будзе выкарыстана пад час выбарчых кампаніяў, калі партструктуры, што ня сталі на ўлік, ня змогуць удзельнічаць у выбарах: вылучаць прадстаўнікоў у камісіі, мець кандыдатаў, назіраць за выбарамі.

Гэтая праблема будзе й надалей актуальнаю для грамадзянскай супольнасьці. Шкада, што яе раней не адчулі кіраўнікі НДА і апазыцыі, бо менавіта ўвесь спэктар праблемаў перарэгістрацыі грамадзкіх арганізацыяў павінен быць першачарговы на кансультацыях з уладамі. Галоўнае зараз: ці не застанецца ў канцы году на кансультацыях з Лукашэнкам наша апазыцыйная генэральская дэлегацыя штабам бяз войска? Ва ўлады зараз ёсьць усе «юрыдычныя» магчымасьці зрабіць менавіта так.

Міхась Лагор, Гарадок

бытавуха

Славамір АДАМОВІЧ

Мілы чалавек

Ёсьць нешта наіўна-шчырае, нават дзіцячае ў тым, як натхнёна Сямён Шарэцкі адкрывае для сябе і нас Беларусь — у артыкулах пра вартасьці беларускага нацыяналізму, пра прыярытэт правоў нацыі перад правамі асобы... Адно, што на ўедлівых журналістаў крыўдуе. Надта ж яны пытаньнямі дастаюць: чаму тое? чаму гэта? чаму тэорыя артыкулаў так кардынальна разыходзіцца з практыкай вуліцаў? Вось і днямі на пытаньне «БДГ» пра пэрспэктывы дзяржаўнага перавароту ў Беларусі — не адказаў, пакрыўдзіўся. Шкада. Але зразумець чалавека можна: паважныя гады, пэнсійны ўзрост, хочацца спакою. З другога боку, капрызы дзяржаўнага мужа Шарэцкага — гэта складовая частка палітычнага дэсэрту. Праўда, нешта доўга да стала не запрашаюць. І ў жываце пачынае бурчэць.

Пра Някляева

Каторы месяц вузкае кола шырокай грамадзкасьці маракуе, што рабіць з паэтам Някляевым. Каб назваць яго героем, змагаром з рэжымам Lu — ня туды тое. Не дацягвае, і значна.

Каб сказаць, што вялікі махінатар — таксама няпраўда. Але ж факт ёсьць факт: сп.Уладзімер у Варшаве, а месца галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца» зьбіраецца заняць паэтка Галіна Булыка. Так, прынамсі, кажуць. Як і тое кажуць, што Ваньку валяць з палітычнай урлой пад камандай былога прэзыдэнта — справа небясьпечная. Можна прапасьці.

Паэту Някляеву пашанцавала — ён своечасова спужаўся і прапаў сабе сам.

Новыя патрыёты

Былы старшыня Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету «Бацькаўшчына» Яўген Лецка апублікаваў у «Народнай волі» артыкул пад назваю «Знак засьцярогі, або Драма беларуса пад дахам «Бацькаўшчыны». Ганна Сурмач, дзейны старшыня Рады ЗБС, пакрыўдзілася на публікацыю Я.Лецкі і ў той жа газэце зьмясьціла свой матэрыял пад назваю «Небясьпечныя гульні, ці Драма замежнага беларуса на Бацькаўшчыне». Зь яго мы і даведаліся, хто ў Беларусі самы «адданы патрыёт», які «шмат гадоў ня проста думае пра Радзіму, знаходзячыся далёка ад яе, але і дапамагае рэальнымі справамі». Чалавек гэты — А.Сілівончык. Той самы, хто фінансаваў налёт сургуцкіх архараўцаў на беларускую вёску Мікалаеўку. ■

«Сьмела, таварышы, у ногу» і «Ў адстаўку» — мэлёдыі рабочага мітынгу

АПОШНІ МІТЫНГ АФІЦЫЙНЫХ ПРАФСАЮЗАЎ?

300 тысяч работнікаў падпісаліся супраць Лукашэнкавага дэкрэту

Андрэй ЛАПЦЁНАК

50 тысячаў на Бангалор не прыйшло. Чырвоныя сьцягі крыху дэзарыентавалі тых, хто шукаў альтэрнатыўны мітынг. «Дык не было іншых, далі гэтыя са складу!» — скажа мне пасьля адзін рабочы з МАЗу, трымаючы ў руцэ чырвоны прапар рэвалюцыі.

Грузавік з гукаўзмацняльнікамі, стацыянарная трыбуна, тэлекамэры. Вакол незнаёмыя людзі, знаёмыя паміж сабой.

«Прывет, Пеця, ты з жонкай?» — чалавек празь мяне працягвае руку свайму прыяцелю. Пеця з жонкай. Стомленыя твары. У чаканьні «завадзкой калёны» курылі, гаварылі пра рознае, разважалі, ці прыйдуць людзі. З гукаўзмацняльнікаў грукатала музыка. «Сьмела, таварышы, у но-о-гу-у-у!» Першая рэакцыя людзей — сьмех, жаданьне падсьпяваць. Аднак усё ж адчувалася, што сярод чырвоных сьцягоў і пралетарскай музыкі затаілася іншае.

Пасьля трэцяй рэвалюцыйнай песьні — «фон» просяць зьмяніць. Жанчына за маёй сьпінай прабралася наперад і зьвярнулася да тых, што стаялі на трыбуне: «А што ў вас такі настрой сьвяточны! Вам вясёла?» Жанчыну падтрымалі: «Хопіць! Наслухаліся! Семдзесят гадоў слухалі!» Вядучы мітынгу вінавата ўсьміхаўся і казаў, што фанатэка багатая, ёсьць і беларускія, і сучасныя песьні. Паставілі беларускую: «І прасыхалі рэкі і азёры, а крыніца поўная стаяла».

Рабочыя, настаўнікі, лекары зь цікавасьцю і ўдзячнасьцю разглядалі адзін аднаго, плякаты і транспаранты. «Не унижайте учителей!» «Повысить зарплату учителю до размера зарплаты сержанта милиции!» «Полицейскому государству — нет!» «Долой дисциплинарный декрет!» Расейская мова транспарантаў пераконвала і бяз словаў старшыні Фэдэрацыі Прафсаюзаў Беларускай Уладзімера Ганчарыка, што «...Акцыю праводзяць выключна ФПБ і Менскае абласное аб'яднаньне галіновых прафсаюзаў!» І ўсё ж калі падышлі калёны, у іх былі бел-чырвона-белыя сьцягі БНФ, сацыял-дэмакратаў і АГП. «Нарэшце!» — выдыхнула адна настаўніца і замахала над галавой бел-чырвона-белым сьцяжком.

«Падышла калёна Завадзкога раёну, павітаем іх, сябры!» — сказаў узмацняльнік і папрасіў людзей ушчыльніцца. Ушчыльніцца было ня так проста, і падумалася, што месца для вялікага сходу людзей няўдалае. Малады хлапец абапёрся на плечы калегаў, і, узьняўшыся над натоўпам, канстатаваў: «Тысячаў 15 ёсьць!» Радасьці ў голасе не было.

Пасьля зачытаньня вітальных тэлеграмаў з розных краінаў сьвету ў адрас мітынгу прадстаўнікі прафсаюзаў паведамілі ў мікрафон:

Выступае дачка Юр'я Захаранкі

Фота IREX-ProMedia

«На шляху да Менску пад рознымі прычынамі супрацоўнікамі міліцыі былі затрыманыя ўсе 4 аўтобусы, якія салігорцы выправілі на Менск. Пара чалавек разам са мной дабраліся на мітынг легкавым аўтамабілем».

«Сёньня ў знак салідарнасьці з вашым мітынгам бастуюць усе рынкі гораду. І ня верце, што прадпрымальнікам абыякавы ваш лёс! Нас хочуць пасварыць! Але ж мы будзем разам!»

«За цяля мы атрымоўваем роўна столькі грошай, каб набыць толькі кірзавыя боты і ватоўку».

На словы «Дарагі прэзыдэнт!», якімі распачала прамову адна прафсаюзная кіраўніца, людзі адказавалі крыкам і сьвістам. Яе словы набылі іншы сэнс, калі лідэр аўтазаводцаў Фядыніч падзячыў Лукашэнку, што ён ня езьдзіць у замежныя камандзіроўкі і тым самым эканоміць народныя грошы.

Калі слова далі Ганчарыку, мужчына, што стаяў бліжэй да трыбуны, зьвярнуўся да натоўпу, махнуўшы ў бок прафлідэра: «А гэты не хацеў прыходзіць!» Ганчарык пачуў. Можа, таму эканамічныя патрабаваньні, агучаныя лідэрам афіцыйных прафсаюзаў гучным і рэзкім голасам, надалі ўсёй ягонай прамове крыху «палітычнага лёску».

Інфармацыю пра 300.000 подпісаў, сабраных пад рэзалюцыяй прафсаюзаў з патрабаваньнямі да ўладаў, сустрэлі авацыямі.

Прамовы Бухвостава чакалі, аратар ён слабы, але застаўся верны свайму апазыцыйнаму іміджу: «Вось я тут бачу транспарант зь лёзунгам: «Не прыніжайце настаўнікаў!», дык, на маю думку, сёньня зьневажаюць ня толькі настаўнікаў. Зьневажаюць усіх нас! І асабіста мне падабаецца іншы лёзунг, які я тут бачу: «Не — паліцэйскай дзяржаве!» «У адстаўку!» — загула плошча.

Між іншых выступаў запомнілася: «Зазірніце ў свае лядоўні! У нас там мыш павесілася!» — «У адстаўку!» — адказваў натоўп.

Адзінадушнасьць кідалася ў вочы. Большасьць людзей, зь якімі ўдавалася пагаварыць, былі адзінадушныя ў галоўных палітычных пераканьнях:

яны хочуць бачыць свайго лідэра і нацыю «моцнымі»;

яны амаль усе лічаць, што ўрад надта вялікі;

яны адзінадушныя ў сваіх уяўленьнях пра ворага нацыі і пра тое, наколькі ён небясьпечны;

нарэшце, яны адзіныя ў сваіх уяўленьнях пра тое, калі трэба скончыць вайну і калі яе трэба пачаць...

Адчуваньне хісткага «міру» зьмянілася яшчэ на пачатку мітынгу, пасьля таго, як людзі заўважылі на дахах дамоў на вуліцы Кульман міліцэйскіх апэратараў і людзей у форме. Адзін з выступоўцаў ахрысьціў іх «карлсанамі». Жанчына з транспарантам сумна заўважыла: «Снайпэры...» Яе горача пераконвалі, аднак, паколькі апэратары амаль ня рухаліся, верылася.

Дачка Юр'я Захаранкі хоча, каб ёй вярнулі бацьку. Прарваўшыся на трыбуну, яна казала пра страх, пра лучнасьць і небясьпеку дыктатуры. «Нам трэба забыцца на страх! Толькі так мы пераможам!»

Пра 17 кастрычніка ніхто з трыбуны не сказаў. Падкрэсьленая дыстанцыя ад апазыцыі гаворыць пра тое, што кіраўніцтва афіцыйных прафсаюзаў дае шанец афіцыйным уладам. Ці мэты дасягнутыя? Ці да іх прыслухаліся? Пабачым рэакцыю ўладаў, хоць яна вельмі дакладна прагназуецца.

І ўсё ж, выбачай, таварышу Ганчарык, 30 верасьня ўжо стала фактам далучанасьці афіцыйных прафсаюзаў да апазыцыі. Распачатая вайна ўладаў з прафсаюзамі, спроба ўцягнуць іх у сварку паміж сабой, гістэрыя ў дзяржаўных СМІ й на тэлебачаньні выштурхоўваюць афіцыйныя прафсаюзы за межы прававога поля. Афіцыйныя прафсаюзы? Для Лукашэнкі такіх больш не існуе. Інакш як ацаніць той факт, што інфармацыю пра мітынг 30 верасьня і пра прынятую на ім рэзалюцыю, падпісаную больш як 300.000 работнікаў, якая называе прэзыдэнцкі дэкрэт №29 незаконным, не надрукавалі дзяржаўныя газэты. Чаму зараз, ужо ведаючы пра гэта, не зьвярнуцца да афіцыйных уладаў з патрабаваньнем агучыць рэзалюцыю на БТ?

Страх трымае. Страх пазбавіцца «афіцыйнага» статусу.

Іншае нясе надзею: Лукашэнку раскусілі. Ён не забясьпечыць права на працу і прыстойны заробак, ня спыніць інфляцыі й падзеньне ўзроўню жыцьця. Таму што страціў рэпутацыю. Таму што вельмі «дарагі» прэзыдэнт. ■

НАЗАВІ ЯГО НАЦЫЯЙ

Працяг са старонкі 1.

Адзін таксіст на маю крытычную заўвагу, што беларусы не такія ўжо талерантныя, выбухнуў нацыянальнай годнасьцю: «Мала вас, жыдоў, адсюль Лукашэнка павыганяў».

Беларусы любяць прыбядняцца, адчуваюць нездаровую цікавасьць да праблемаў іншых. Часта назірала, як людзі ўсьміхаюцца, гледзячы з тралейбуса на аварыю і пабітую машыну. Тут любяць таксама апэраваць стэрэатыпамі. Каляровыя цывілізацыйныя штучкі беларусы разглядаюць з доляй падазрэньня ці раздражненьня. Мяне пераконвалі, што ў Гішпаніі ня ведаюць пра існаваньне «Галіны Блянкі». Аказалася, ведаюць і нават у жоўценькіх пакетах прадаюць засушаныя пельмені. Наш пуставаты «Макдональдз», у пагаршэньні эканамічнай сытуацыі невінаваты, стратэгічна выкарыстоўваецца для крытыкі Захаду і нібыта зьвязанай зь ім апазыцыі. «Знамя юности» напісала пра пікет Хартыі '97 у падтрымку Маршу Свабоды 17 кастрычніка. Пікет быў праведзены ў навязаным уладамі месцы дысьлякацыі апазыцыйнага мысьленьня — ля «Макдональдзу» на плошчы Бангалор, а газэтка высьлужылася: «Сетка буржуазных рэстаранаў «Макдональдз» адмовілася браць удзел у конкурсе для студэнтаў, прапанаваным нашай газэтай, і выдзеліць пераможцам сякі-такі гамбургер... Затое з радасьцю прымае бясплатны «прамоўшн» ад беларускай апазыцыі. Ясна: простаму народу й гамбургер не па зубах, і да лёзунгаў бела-чырвоных справы няма — бульбы б на зіму купіць...»

Зьнікненьне ў краіне людзей для простых беларусаў нішто ў параўнаньні з хваляй тэрарызму ў Расеі. А Лукашэнка праект дамовы аб беларуска-расейскай дзяржаве назваў «пасьмешышчам». І цынічна параўнаў: «Мяне там бамбяць з Масквы, як тую Чачню...»

Беларускі народ умее перажываць акупацыі. Працяглыя, як расейская, балючыя, як прарасейская, ганебныя, як Мікалаеўка. Зрэшты, на маё бясконцае «народ» калега ўжо зрабіў заўвагу: «Назаві ты яго нацыяй...» ■

Валеры Шчукін: «АДПАЧЫВАЮ НА АКРЭСЬЦІНА»



Фота Эрнста Цецяроўскага

Дэпутата й дысыдэнта Валер'я Шчукіна я вызваніла ў Менску не адразу. Гэткую няўлоўнасьць некаторыя тлумачылі мне тым, што Шчукін нібыта зьбіраўся зьехаць у адпачынак. «Мой адпачынак ад мяне мала залежыць: звычайна я еджу адпачываць на Акрэсьціна*», — сказаў мне сам сп.Шчукін, калі я ўсё ж знайшла яго.

— Распавядзіце, калі ласка, пра сваё маленства. Што, на Вашую думку, найбольш паўплывала на фармаваньне той асобы, якую мы ведаем?

— Нарадзіўся я ва Ўладзівастоку. Бацька ў мяне расеец, маці беларуска. Ва Ўладзівастоку я скончыў першы кляс. На пачатку другога я прыехаў у Беларусь, на радзіму-маці, у Талачынскі раён. Скончыў пачатковую школу на беларускай мове. Маці чамусьці вельмі хацела, каб я вучыўся на расейскай. Гэта была адна з прычынаў таго, што мяне прывезьлі ў Менск.

Бацькі мяне вучылі не супраціўляцца нічому. Вучылі, наадварот, саступаць, ня лезьці на ражон. 37-ы год настолькі адбіўся на маім бацьку — не таму, што яго арыштавалі, а таму, каб... не адкрываць роту. Нават у наш час (ён ужо памёр, бацька), калі можна было ўсё, што хочаш гаварыць, мы зь ім на кухні сядзім, гаворым — і то ён не хацеў улазіць у мінулае, не любіў, калі распавядалі палітычныя анэкдоты. Натуральна, гэта і мне перадавалася. Я ўступіў у жыцьцё не гатовым да жыцьця. Але армія зрабіла сёе-тое, і жонка паўплывала... І цяпер маем тое, што маем. Я, якім вы мяне ведаеце — гэта маё ўласнае вынаходніцтва.

Я не зьбіраўся быць вайскоўцам. У 15 гадоў пайшоў на працу. Працаваў па восем гадзінаў, не па чатыры, як цяпер. Закон, што дзеці да шаснаццаці працуюць па чатыры гадзіны, выйшаў, калі мне ўжо быў 19-ы год. «Укалваў» тут, у Менску, на заводзе буддэталяў, сьлесарам. Тры гады, пакуль не пайшоў у 18 гадоў у войска. Канфлікт з бацькамі (я хацеў самастойнасьці, а яны спрабавалі мяне абмежаваць) выклікаў жаданьне сысьці. Прычым — куды заўгодна сысьці. Я мог і на цаліну паехаць. Але тут мяне выклікалі ў ваенкамат і прапанавалі служыць у войску. Ім якраз прыйшла разнарадка. Я ткнуў пальцам...

— Наўздагад?

— Ну, не зусім наўздагад! Ваенна-марская вучэльня мне была больш па душы.

— Вернемся да сучаснасьці. Вы змаглі сумясьціць тое, што шмат каму здаецца несумяшчальным: камунізм і абарону нацыянальных інтарэсаў. Гэта што, новы «нацыянал-камунізм» альбо, скажам, «камуністычны нацыяналізм»?

— А чаму Вы лічыце гэта несумяшчальным?

— Бо ў нас звыклі трактаваць інтэрнацыяналізм, савецкі інтэрнацыяналізм як нешта супрацьлеглае нацыянальным інтарэсам невялікіх народаў.

— Інтэрнацыяналізм мае на ўвазе салідарнасьць рабочых, бо ў буржуазіі — гаворачы маёй камуністычнай мовай — салідарнасьць была, ёсьць і будзе. Мафія інтэрнацыянальная. Буржуазія інтэрнацыянальная, яна ўкладае свае капіталы там, дзе ёй выгадна, незалежна ад нацыянальнай мяжы. А рабочых розных нацыянальнасьцяў цкуюць адных на адных. У гэтым сэнсе я інтэрнацыяналіст. Калі нам, скажам, аказваюць дапамогу польскія прафсаюзы — гэта ж таксама інтэрнацыяналізм.

Мафія інтэрнацыянальная. А рабочых розных нацыянальнасьцяў цкуюць адных на адных. У гэтым сэнсе я інтэрнацыяналіст.

Адзінае, што цяпер цяжэй нешта вызначаць з клясавага пункту гледжаньня. Сам я з паходжаньня рабочы, мае бацькі былі рабочымі. Але цяпер трохі іншая сытуацыя, чым калі я быў малы. Цяпер няма чыстага падзелу грамадзтва на клясы: вось гэта рабочы, гэта інтэлігенцыя. Хто, дапусьцім, такі інжынэр-кампутаршчык — рабочы ці інтэлігенцыя? Нават інжынэра, які на заводзе працуе, яшчэ пытаньне, ці можна назваць інтэлігенцыяй. Сёньня клясы перамяшаліся. Таму гаварыць пра інтэрнацыяналізм у клясавым разуменьні ўжо не выпадае. Цяпер што датычыць нацыяналізму, як Вы яго называеце. Я не адстойваю нацыяналізму. Я адстойваю правы людзей, гарантаваныя і Канстытуцыяй, і міжнароднымі нормамі, і ўвогуле чалавечым паняцьцем. Чалавек мае права. І ў гэтым сэнсе чалавек мае права, у тым ліку, і стварацьдзяржаву ў маштабах Беларусі — і нават у маштабе Менскай губэрні. Іншая справа, што я не прыхільнік гэтага. Я ведаю, што разам таньней і лепей жыць. Амэрыка лепей жыве, бо гэта вялікая дзяржава.

Сёньня я адстойваю ня столькі незалежную Беларусь, колькі права людзей жыць так, як яны хочуць. Калі беларусы хочуць жыць асобна, значыць, будуць жыць асобна. Камунізм дрэнны не таму, што ён камунізм, што ідэя кепская. Дрэнны ён таму, што яго насаджалі сілай. Чалавек павінен сам вырашаць. За каго Вам выходзіць замуж, Вы вырашаеце самі. Вы можаце пяць разоў памыліцца. Магчыма, бацькі лепей вырашаць, чым Вы. Але выдаваць Вас сілай замуж бацькі ўжо ня могуць.

Чаму ў нас сёньня праблемы?

Калі праходзілі выбары, я быў трактарыстам. Калі мяне абралі, і трэ было прыехаць у Менск — я выцер рукі, здаў трактар і паехаў.

Цяпер няма чыстага падзелу грамадзтва на клясы: вось гэта рабочы, гэта інтэлігенцыя. Хто, дапусьцім, такі інжынэр-кампутаршчык — рабочы ці інтэлігенцыя? Нават інжынэра, які на заводзе працуе, яшчэ пытаньне, ці можна назваць інтэлігенцыяй. Сёньня клясы перамяшаліся. Таму гаварыць пра інтэрнацыяналізм у клясавым разуменьні ўжо не выпадае. Цяпер што датычыць нацыяналізму, як Вы яго называеце. Я не адстойваю нацыяналізму. Я адстойваю правы людзей, гарантаваныя і Канстытуцыяй, і міжнароднымі нормамі, і ўвогуле чалавечым паняцьцем. Чалавек мае права. І ў гэтым сэнсе чалавек мае права, у тым ліку, і стварацьдзяржаву ў маштабах Беларусі — і нават у маштабе Менскай губэрні. Іншая справа, што я не прыхільнік гэтага. Я ведаю, што разам таньней і лепей жыць. Амэрыка лепей жыве, бо гэта вялікая дзяржава.

Сёньня я адстойваю ня столькі незалежную Беларусь, колькі права людзей жыць так, як яны хочуць. Калі беларусы хочуць жыць асобна, значыць, будуць жыць асобна. Камунізм дрэнны не таму, што ён камунізм, што ідэя кепская. Дрэнны ён таму, што яго насаджалі сілай. Чалавек павінен сам вырашаць. За каго Вам выходзіць замуж, Вы вырашаеце самі. Вы можаце пяць разоў памыліцца. Магчыма, бацькі лепей вырашаць, чым Вы. Але выдаваць Вас сілай замуж бацькі ўжо ня могуць.

Чаму ў нас сёньня праблемы? Лукашэнка спрабуе сілай зацягнуць усіх у саюз, нешта цішком падпісвае. Вядома, я адмаўляю такое, бо ў мяне ж не пытаюцца! Я адмаўляю ўсё, што робіцца негалосна.

Вось апублікавалі, што Ярмошын выдзяляе кожнай сям'і, якая мае трох дзяцей і больш і ў якой на чалавека прыпадае менш мінімальнага бюджэту, па 5 мільёнаў рублёў. З аднаго боку, гэта добра. А з другога — ты мяне прабач, а зь якіх сродкаў? У бюджэце гэта не закладзена. Значыць, ён гэтыя грошы, якія не ягоныя, а нашы, разьмяркоўвае, як хоча. Гэта нават не гарсавет вырашыў! Замест таго, умоўна кажучы, каб даць кожнаму нармальную зарплату, пэнсію, ён дэманструе: «Я харошы».

— Вы ўваходзіце ў камісію па справе Ганчара і Красоўскага, створаную Вярхоўным Саветам. Як ідзе расьсьледаваньне?

— Камісія стваралася не для таго, каб праводзіць паралельнае расьсьледаваньне. Для гэтага трэба пэўныя сілы і сродкі. Камісія стваралася, каб падштурхоўваць улады і супрацоўнічаць зь імі. Мы пачалі з афіцыйнага ліста міністру ўнутраных справаў; правялі акцыю з уручэньнем патрабаваньня. У той жа дзень узбудзілі крымінальную справу. А перад тым ішло расьсьледаваньне ў рамках вышуковай справы. Гэта абсалютна розныя мерапрыемствы. Мы ўлады падштурхнулі. Бо ўлады ня хочуць займацца гэтым як сьлед. Адбылося палітычнае выкраданьне — наша вэрсія такая. Улады фармулёўкі «палітычнае выкраданьне» чамусьці ўпарта пазьбягаюць. Яны ўсё што хочаш могуць сказаць, у тым ліку і «загуляў», «запіў», «бандыты расправіліся» — акрамя аднаго. Аб тым, што правільнай ёсьць вэрсія аб палітычным выкраданьні, сьведчыць той шум-гам, які паднялі зь Вільняй. Хлопец, які «бачыў Ганчара», уяўленьня ня мае, ён там ня быў. Савецкі райаддзел увогуле «віленскі варыянт» адхіляе. Чаму ён, гэты самы Васільчанка, напісаў пра Ганчара — халера яго знае. Нібыта аўдыёзапіс у яго ёсьць... Але чаму надрукаваў у «Белорусской ниве»?.. Чаму пабег у чужую газэту стукацца, ня ў свой «Частный детектив»? І тыя зьвесткі неадкладна пачынае распаўсюджваць Беларускае тэлебачаньне. Гэта сьведчыць пра тое, што ўлады спрабуюць завесьці некуды ў бок...

Перамовы з Лукашэнкам ня маюць сэнсу. Зь ім размаўляць няможна. Яго можна толькі прымушаць.

— Перад шэсьцем прафсаюзаў 30 верасьня Вы сказалі, што пойдзеце ў калёне разам з рабочымі МТЗ. Чаму менавіта з рабочымі, а ня з прэсай?

— Чакай, а дзе прэса звычайна ідзе?

— Сваёй купкай...

— А, вось што! Я — адзіны дэпутат-рабочы, атрымліваецца. Я ж пасьля таго, як звольніўся з войска, пайшоў працаваць трактарыстам. Восем гадоў працаваў трактарыстам. У гэтым сэнсе я адзіны дэпутат ад станка. Вылез з-пад трактара, выцер рукі... Калі праходзілі выбары, я ж быў трактарыстам. А калі мяне абралі дэпутатам і, нарэшце, трэ было прыехаць у Менск — я выцер рукі, здаў трактар і паехаў у Менск. У гэтым сэнсе трактарабудаўнікі мне бліжэйшыя.

— Колькасьць Вашых адміністратыўных «адседак» за апошнія пару гадоў такая, што ўжо цягне на крымінальную справу...

— Даўно ўжо!

— Як Вы лічыце, яны ўсё ж баяцца чапаць Вас?

— Думаю, што баяцца. Баяцца пратэстаў, розгаласу. За што пасадзіць мяне? За тое, што ішоў са сьцягам? Клімаву прыпісваюць крыміналышчыну — грошы, Кудзінаву — хабар, Чыгіру — невяртаньне крэдытаў, Ганчару — нейкія там грошы таксама. Але я ж, прабач, атрымліваю пэнсію ды ганарары за тое, што пісаў. Мне грошы не прышыеш. За што мяне ні пасадзі, гэта ж адназначна будзе палітычная справа. Калі толькі нешта прыпісаць... Хоць — былі прыпісалі! Апошні раз, калі я бунтаваў, што мяне не пускалі ў суд, я насамрэч супраціўляўся міліцыі — яе незаконным дзеяньням. Могуць, могуць прыпісаць! Але гэтыя абвінавачваньні рана ці позна рассыпаюцца ўшчэнт.

— А Вы не баіцеся жыць у нашай краіне? І як мяркуеце: бліжэйшым часам ці змогуць улады і апазыцыя пра нешта дамовіцца?

— Я — салдат. Я 27 гадоў вучыўся ваяваць. Умець ваяваць — гэта ня значыць умець страляць альбо запускаць ракеты. Гэта гатовасьць ісьці пад кулі, калі вобразна казаць. Дзе небясьпечна, туды ідзеш. Я за гэта грошы атрымліваў. Ты можаш баяцца, хавацца, але калі трэба туды ісьці й там небясьпечна, дык я ня маю права хавацца. Я павінен ісьці, пакуль хаваюцца астатнія, несалдаты. Больш, я з усіх дэпутатаў адзіны кадравы вайсковец. Сярод усіх астатніх званьні і вышэйшыя за маё ёсьць, але яны — міліцыя, пракуратура... Яшчэ адзін кадравы афіцэр з войска — Шпакаў, але ён у «палаце». Дык каму, калі ня мне, ісьці наперад?! Кадравая армія павінна стрымаць праціўніка да таго моманту, пакуль змабілізуюць астатніх. Гэтак і я сёньня. Пакуль я адзіны, але, калі змабілізуюцца ўсе, будзе лягчэй.

Перамовы з Лукашэнкам ня маюць сэнсу. Зь ім размаўляць няможна. Яго можна толькі прымушаць. Але справа ў тым, што мы ня можам прымусіць. Прымусіць можна, калі нас выйдзе 100, 200 тысячаў. Але, тым ня менш, у нас два шляхі: альбо браць аўтамат і ісьці на барыкады — альбо садзіцца за стол перамоваў. Аўтаматы ўся апазыцыя адмаўляе адназначна. Што б там Лукашэнка ні казаў, ніхто не заклікае народ на барыкады. Мір лепшы. Але нешта ж трэба рабіць. Нічога не рабіць зусім нельга! Гэтыя перамовы будуць заваленыя, нічым ня скончацца. Я адмыслова ня лезу сам у перамоўны працэс. Навошта гэта мне? Браць удзел у гэтых перамовах — тое самае, што пісаць у сьметніцу. Вядома, набіраесься досьведу, нешта застаецца, тэма ўсё адно не прападае, калі-небудзь ты яе па-іншаму распрацуеш — але ж у сьметніцу! Вось я й ня лезу... З Лукашэнкам трэба як Хрушчоў: выходзіць на трыбуну, і ботам: «Я табе пакажу кузькіну мацьі» Зь ім толькі так трэба размаўляць. Па-іншаму немагчыма.

Гутарыла Тацяна Сьнітко

**На вуліцы Акрэсьціна ў Менску знаходзіцца міліцэйскі прыёмнік-разьмеркавальнік, куды зазвычай прывозяць затрыманых удзельнікаў апазыцыйных акцыяў.*

■

Беларусы атакуюць

Фота IREX-ProMedia.

СКА ПРАБІВАЕЦЦА Ў ЛІГУ

Пасьля паразы зборнай у накаўт-раўндзе ад Украіны надзея беларускіх аматараў гандболу — вечны чэмпіён Беларусі менскі СКА. Ад яго залежыць, ці ўбачым мы ўвосені на сваіх пляцоўках вялікі гандбол. Але першая гульня зь італьянскім чэмпіёнам «Прата» ў Менску ўчора за права гуляць з наймацнейшымі клюбамі пакінула нас у трывозе і няўпэўненасьці: СКА выйграў, але зь перавагай усяго 2 мячы 23:21.

Прайграць «Прата» па суме дзьвюх сустрэчаў будзе крыўдна: італьянцы не паказалі зь сябе ў Менску нічога звышнатуральнага. Адзіная перавага іх заключалася ў досьведзе. Досыць сказаць, што самыя маладыя зь італьянцаў, варатар Джульяна Данты і крайні Міран Ам'енавіч маюць па 25 гадоў. Большасьці ж астатніх ужо пераваліла за 30 (а лідэру каманды, удзельніку зборнай Італіі Сетым'я Масоці споўнілася 35). Для параўнаньня: самы дасьведчаны армеец Уладзімер Гольдзін мае 26 гадоў. Агульны ўзровень італьянскага гандболу невысокі: як і беларусы, італьянцы ня трапілі на чэмпіянат Эўропы. Дарогу ім перайшлі нарвэжцы.

З прычыны паважнага ўзросту італьянцаў можна было прадказаць іхную ўстаноўку на гульню: вязкая абарона і працяглыя пазыцыйныя розыгрышы ў атацы. Маладыя армейцы маглі супрацьставіць гэтаму толькі высокі тэмп гульні (са славутым армейскім адрывам — хуткім пераходам ад абароны ў атаку). У цэлым, італьянцы здолелі навязаць сваю гульню. Ад самага пачатку йшла вязкая барацьба з перавагай армейцаў у 1—2 мячы. Вынік пасьля першай паловы матчу быў 12:10. Пачатак другога тайму падараваў нам надзею на больш упэўненую перамогу: беларусы амаль усю другую палову вялі зь перавагай у 3—4 мячы. Упэўненую гульню ў атацы дэманстравалі нашы лідэры Ўладзімер Гольдзін і Андрэй Курчэў (маладая зорка — яму ўсяго 19 гадоў), якія закінулі па 8 мячоў. Часта выручаў каманду і галкіпер Мікалай Гальмак — падобна, што пасьля ад'езду Віталя Фешчанкі ў французкую «Тулюзу» яму знайшлі годную замену. Але ў самы адказны момант у гульні нашых адбыўся зрыў, і: 23:21. Нашы па заканчэньні сустрэчы сумавалі, італьянцы віншавалі адзін аднога.

Пасьля сустрэчаў з «Прата» (незалежна ад іх выніку) каманду пакідае самы дасьведчаны наш гандбаліст Уладзімер Гольдзін, у якога ўжо гатовы кантракт з адным з клюбаў другой нямецкай лігі. На жаль, мы ня можам прапанаваць сваім гандбалістам нават тых грошай, якія яны маюць у другіх лігах на Захадзе. А наш мэтр, зь імем якога зьвязаныя ўсе посьпехі беларускага гандболу, Спартак Мірановіч, хутчэй за ўсё ўзначаліць зборную Эгіпту — лепшую неэўрапейскую зборную сьвету. Тады толькі выхад СКА ў Лігу чэмпіёнаў дасьць нам падставы казаць, што беларускі гандбол яшчэ жывы. ■

дзе варта быць

У Пінску

У горадзе над Пінай ідзе выстава **«Медны посуд XVIII—XX ст.»**, наладжаная Музэем беларускага Палесься. Экспанаты прэзэнтаваў Нацыянальны музэй гісторыі і культуры Беларусі.

Выставы

Інстытут Гётэ сумесна зь Беларускай акадэміяй мастацтваў ладзіць сэрыю выставаў **«Набліжэньне і аддаленьне»**, якая прэзэнтуе фатаграфію Нямеччыны з 1850 году да нашых дзён. Выстава з сэрыі пройдзе з 1 па 22 кастрычніка ў Музэі Беларускай акадэміі мастацтваў (корпус у дварэ).

Усім зацікаўленым — ад бізнэсоўцаў да хакераў — варта наведаць выставу інфармацыйных тэхналёгіяў **«Infobel»**, а таксама выставу праграмных сродкаў **«Софт-Менск»**, якія пройдуць 8—10 кастрычніка ў новым выставачным комплексе ў Баравой пад Менскам. Даведкі можна атрымаць на сайце www.infobel.solo.by.

«БелЭКСПА» з 5 да 8 кастрычніка праводзіць выставу **«Мэдычнае абсталяваньне»**. Адкрыццё 5-га а 12-й, у іншыя дні працуе ад 10-й. На выставе будуць прадстаўленыя мэдтэхніка, новыя мэдычныя сродкі й літаратура і ўсе навінкі сьвету мэдыцыны.

Музыка

5 кастрычніка а 19-й у Філярмоніі будуць лунаць экзатычныя мэлёдыі — там адбудзецца **канцэрт індыйскай музыкі**. А перад тым як атрымаць асалоду ад гукаў сарангі, сітара і табла, аматары маюць магчымасьць пабачыць у фае выставу твораў Рабіндраната Тагора.

Тамсама 10-га адбудзецца **канцэрт арганнай музыкі**. Творы І.С.Баха, Ж.Юрэ, О.Чакебаці і іншых кампазытараў будзе выконваць арганіст з Францыі Ален Бавэ.

9 і 10 кастрычніка на «Вольнай сцэне» будзе **канцэрт-спатканьне бардаў «Нябачны мур»**, прысьвечаны 10-й гадавіне падзеньня Бэрлінскага муру, з удзелам Алеся Камоцкага, Віктара Шалкевіча, Шымона Зыховіча, Дытэра Калькі ды іншых бардаў зь Нямеччыны, Польшчы й Беларусі. Пачатак канцэртаў а 19-й.

Кіно

Фэстываль каротказмэтражных фільмаў «Калекцыянэры імгненьняў» у Белсаўпрофе працягваецца на гэтым тыдні. 4 кастрычніка будуць ісьці фільмы безь перакладу, 5 кастрычніка — нізка стужак «Дзівацтвы», а 6 кастрычніка можна будзе пабачыць фільмы «ад каротказмэтражнага да поўнамэтражнага». Самы доўгі фільм цягнецца 26 хвілін, а самы кароткі — усяго 5 хвілін. Паказы пачынаюцца а 19-й.

Расклад паказаў відэафільмаў у клюбе на сядзібе ТБМ (Румянцава 13) на суботу 2 кастрычніка:

16.15: «Рок-каранацыя '98».

18.00: «Страчаны сьвет. Юрскі парк-2».

Уваход вольны.

Опэра

У Беларускай опэры 5 кастрычніка будзе гучаць **«Сэвільскі цырульнік»** Дж. Расіні. 7 кастрычніка можна будзе завітаць на опэру В.А.Моцарта **«Зачараваная жалейка»**. У суботу 9 кастрычніка народны артыст Беларусі Сяргей Картэс прадстаўляе сваю опэру ў дзьвюх дзеях **«Візыт дамы»**. 10 кастрычніка — **вечар рамансаў**.

Балет

6 кастрычніка на сцэне змагаецца зь ветракамі **«Дон Кіхот»** Л.Мінкуса. 8 кастрычніка адбудзецца **«Спартак»** — балет у трох дзеях паводле А.Хачатурана. Раніцай у нядзелю 10 кастрычніка для дзетак — **«Чыпаліна»**.

Тэатар

На «Вольнай сцэне» 5 і 6 кастрычніка працягваецца **«Узьлёт Артура Ўі**, які можна было спыніць» Б.Брэхта ў перакладзе Васіля Сёмухі.

У аўторак, сераду й чацьвер у Купалаўскім тэатры спэктакляў ня будзе. Бо 8, 9 і 10 кастрычніка адбудзецца самая дарагая беларуская пастаноўка апошняга часу, **«Князь Вітаўт»** паводле А.Дударава ў рэжысуры В.Раеўскага. Дванаццацітонная дэкарацыя мантуецца некалькі дзён. Пад час будаўніцтва бедныя работнікі сцэны жартуюць, што, напэўна, малым мастак Герлаван марыў працацачны канструктар, а яму не куплялі. І вось мара мастака зьдзейсьнілася праз сорак гадоў.

Спэктакаль публіка ацэньвае па-рознаму, але ў адным яна аднадушная — убачыць «канструктар Герлавана» хоць аднойчы ў жыцьці варта.

ДК НКВД (Камсамольская, 30) запрашае нас 4 і 9 кастрычніка на новую прэм'еру Мікалая Пінігіна, спэктакаль паводле М.Гладзіліна **«Боты на тоўстай падэшве»**. Варта схадзіць хоць для таго, каб зірнуць на шыкоўныя мармуры залі.

Спорт

9 кастрычніка на стадыёне «Дынама» ў 20.30 распачнецца апошні матч нашай зборнай на ЭЎРА-2000, **гульня са зборнай Італіі**. Італьянцам мусова перамагчы, дык мабыць будзе на што паглядзець.

Зьміцер Бартосік, Аляксандар Кудрыцкі

Новае пакаленьне на сцэне ДЛ

28 верасьня ў сталічным Доме Літаратара прайшла вечарына сяброў літаб'яднаньня «Літаратар». Спачатку нешматлікіх гледачоў абурыў чырвона-зялёны сьцяг, прымацаваны да заслоны, але ніхто з маладых талентаў не рашыўся яго зьняць. Тады зьявіўся электрык зь лесвіцай і пад задаволеныя воплескі вырашыў праблему. На сцэне распачалася дэманстрацыя літаратурных здольнасьцяў. Віктар Жыбуль, названы вядучай нячысьцікам беларускай паэзіі, прачытаў пра пэнсіянэра і пэнсіянэрку, якія выгульвалі сучку, якая рабіла самі ведаеце што. Студэнтка італьянскага аддзялення філфаку Ксеня Брэчка зьвярнула ўвагу шаноўнай публікі на той факт, што “”перхоть падает хлопьямі'', чым вельмі засмуціла прысутных у залі эстэтаў і насьцярожыла жыдоў. Міла глядзеўся са сцэны дзявочы дуэт “”Дзьмухаўцы'' (прагучаў тэкст пра мыш і камара). У Міколы Адама, аўтара “”Варштатаў'', балелі зубы, таму і дэклямацыя была адпаведнай. Вершы Ўсевалада Гарачкі, сьмела агучаныя аўтарам, распружылі публіку і годна завяршылі вечарыну.

С.А.

Яго Надзея

30 верасьня ў Палацы Мастацтваў адчыніла свае дзьверы выстава “Мая надзея”, прысьвечаная памяці мастака і мастацтвазнаўцы Генадзя Сокалава-Кубая, якога называюць адным з найбуйнейшых тэарэтыкаў беларускай нацыянальнай культуры. Ён сышоў ад нас год таму.

Сярод твораў — малюнкі, карціны з адметнай сэрыі “Стары Менск”, дзе вылучаецца палатно “Маё Нараджэньне” з выявай напаўразбуранай начной сталіцы зь непустой шыбеніцай на пярэднім пляне і адзіным вакенцам з запаленым сьвятлом (Сокалаў-Кубай нарадзіўся ў 1942 годзе). Асаблівай увагі вартыя выцінанкі, прысьвечаныя 25-му Сакавіка, Слуцкаму Збройнаму чыну, Вільні.

Выстава працягнецца да 10-га, а 7-га ў яе рамках пройдзе канфэрэнцыя пра жыцьцёвы і творчы шлях Генадзя Сокалава-Кубая.

Анатоль Прасаловіч

дзёньнік маладога спэцыяліста

БУЛЬБА

Сяргей БАЛАХОНАЎ

Слухаючы ў дызэлях размовы пралетараў, дачнікаў і здэклясаваных **элемэнтаў**, яшчэ раз сьцьвярджаюся на думцы, што маса маіх суграмадзянаў жыве чужым жыцьцём.

Тут паблізу Масква, тут Масква ў галаве,
Тут Масква ў тэлевізары, і ў газэце...

Дапраўды, ім больш рупіць Беразоўскі ці Пуцін, Салжаніцын ці Бора Маісееў з Трубачом, а ня тыя й тое, што атачае іх кожны дзень. З замілаваньнем згадваюць часы Брэжнева: «Хай бы ён сабе хоць сто зьвёзд навешаў, бо жыць жа людзям даваў». Лідэраў беларускай апазыцыі спрэс лічаць палякамі альбо жыдамі. «Есьлі б Шушкевіч шчэ пару гадоў паправіў, то жылі б ужо пад Польшчаю», — агучваючы пастуляты афіцыйнай прапаганды, выдыхнуў зь сябе тоўсты грыбнік. Пра Лукашэнку, праўда, калі й прыпамінаюць, дык зусім бяз богабаязнага трымценьня, а скарэй з горкім сарказмам. Баяцца, што выбухі дамоў з Расеі перакінуцца ў Беларусь. Так узгадваецца Бацькаўшчына...

За ўсё сваё жыцьцё мне ані разу не выпадала ўдзельнічаць у бітвах за калхозны ўраджай. Нават у студэнцтве радасьць гэная мяне абмінула... «Паўтараю для глухіх і слішкам вумных: заўтра ідзём на картофель», — абвясьціў дырэктар белабалоцкім шкалярам. Сухая зямля, пыл, крыкі й гоман дзятвы, выбіраньне бульбы. І настаўнікі, як цівуны, толькі падаюць каманды ды натуюць вынікі. Дурасьць, малаплённа. Пад час нашага трэцяга выйсьця «на картофель», поруч зь дзецьмі на полі корпаліся псыхічнахворыя з Барышчоўкі. Не зважаючы на ладны вецер, яны былі адзетыя толькі ў бальнічныя піжамы ды халацікі. Малыя дзівіліся і троху лякаліся іх. Дык што ж, рабі пільна?..

Не падумаў бы, што ў Б.Б. можа ўзьнікнуць чыста гарадзкое зьявішча — затор. Аднаго разу ён паўстаў праз даішнікаў, якія на ўезьдзе ў вёску пачалі спыняць усялякіх драйвэраў & трактардрайвэраў з праверкаю дакумэнтаў, страхавое карткі ды тэстам на алькаголь. Разумныя старшакляcьніцы згадвалі пра «канец месяца» і «мянтоўскі плян». Нехта перажываў, успамінаючы, што татачка пры пахмельлі. Зрэшты, абышлося. Другі раз затор зрабілі два каровія статкі, што мерна, але дужа позна для выгану быдла, прасоўваліся па залупінскім тракце. Гладкія тачкі гарадзкое буржуазіі, якія звычайна з ачмурэннай хуткасьцю нясуцца да сваіх сельскіх маёнткаў, тармазілі, а хадзяевы цішкалі на сыгнал... Наагул, здаецца, што ў Б.Б. суіснуюць як права-, так і левабаковы рух. Выяжджаючы на вуліцу Школьную, я пастойна мушу зварочваць, бо насустрач па маёй паласе кампідосіць які-небудзь трактар. Недарма ў школе праводзіўся тыдзень правілаў дарожнага руху.

Падручнікі сусьветнай гісторыі перакладзеныя з расейскай. Толькі на якую мову? Пішуць, што на беларускую. Ага, толькі словы *«кофе»*, *«распушчанасць»*, *«абуржуазеўшыеся феадалы»*, *«пачвар»* (муж. род), *«ружжы і пушкі»*, *«устройства»*, *«грамадзянская грамадскасць»*, *«навейшая гісторыя»*, *«прадстаўляць сабой»* ды інш. Апроч такой дубовай лексыкі, кніжкі маюць дубовы стыль. Іх папросту нецікава чытаць.

Дазнаўся, што адна мая ўнівэрсытэцкая выкладчыца дужа адмоўна азвалася аб маіх допісах пра Белае Балота. Акрэсьліла іх паняткам «эксгібіцыянізм». Нехай так. Але мой пэрсанальны эксгібіцыянізм ёсьць толькі маленечкаю часьцінкай у мазаіцы ўсеагульнага згаленьня і чыстай парнаграфіі, якімі красуе сёньняшняя Беларусь. Маркоціць толькі, што шаноўную спадарыню засмуціла маё мацюканьне па-маскальску, а ня тое, што ейны ня самы горшы студэнт вымушаны пад пагрозай страты дыплёму марнаваць жыцьцё ў балоце. ■

ЧАЧЭНІЯ І КРЫЗЫС БЕЛАРУСКАЙ ТЭЛЕКАРЦІНКІ

Лёлік УШКІН

Апошнім часам расейскія каналы неяк нечакана ахвотна займаюцца «раскруткай» беларускіх дэмакратаў. На першы плян выйшаў Лукашэнка — славянскі ідэаліст і вечны хаўрусьнік. Трансфармацыя іміджу Беларусі на маскоўскім ТБ зьвязаная з крызысам старой вэрсіі тэлекарцінкі «Расея — вялікая дзяржава, што ўстае з каленяў». Знакавым сымбалем рэнэсансу была расейска-беларуская інтэграцыя. У рэпартажах ОРТ, НТВ і РТР яна падавалася ў выглядзе манатоннага цалаваньня Лукашэнкі з заежджым прэм'ерам-летуном з Масквы. Потым на экране зьяўляліся закутаныя ў банданы твары беларускіх апазыцыянэраў з праспэкту Скарыны. Прысутнасьць у рэпартажы менскіх індэпэндэнтыстаў надавала інтэграцыі нейкую інтрыгу, што было як бальзан на раны расейскіх абываталяў. Фіяска на Каўказе яны кампэнсавалі зводкамі зь беларускай сталіцы, дзе бацька «бліскуча» зрываў адну за адной змову падсподных нацыяналістаў.

Гэты стэрэатып Беларусі быў створаны для расейскага спажыўца і стаў дамінаваць на інфармацыйным рынку. Наша апазыцыя несьвядома ператварылася ў статыста або дэкарацыю для тэлекарцінкі. Засьвяціцца на НТВ было іншы раз галоўнай мэтай дэмакратычных вылазак.

Сёньня сытуацыя зьмянілася. Вайна на Балканах і веснавы скачок расейскага дэсанту на Прышціну нарадзіў новыя мадэлі візуальнага вобразу адраджэньня магутнасьці расейскай нацыі. Цяпер нават абываталь з Мухасранску жадае бачыць у тэлеролікаў не пацалункі ўзасос у духу брэжнеўскага палітбюро, а ўсё новыя захопы новых прышцінскіх аэрадромаў. Тым больш, такія сцэны пасуюць масаваму рыначнаму густу, які вырас на папулярным fiction пра «камандас» і ўнівэрсальных Ван Дамаў.

Ваенная трывога на Каўказе часткова — прадукт пераваротаў у масавай сьвядомасьці.

Што да іміджу Беларусі як славянскага авангарду, ён выцясьняецца чачэнскай чарнухай Няўзорава... Цяпер Беларусь павінна заняць сваё традыцыйнае месца ў адпаведнасьці са структурамі папулісцкіх мітаў.

Расейскі сацыёляг Сасноўскі, дасьледаваўшы дынаміку калектыўных міталягемаў расейцаў і амэрыканцаў, сьцьвярджае, што ў мэнтальных раскладах імпэрыялістычных нацыяў заўсёды прысутнічае пара народаў-антыподаў. Гэтак для WASP (белага англасаксонца-пратэстанта) індзеец ёсьць прадстаўніком варожай незразумелай культуры, зь якой магчымы толькі дыялёг паводле вядомага прынцыпу: «Добры індзеец — мёртвы індзеец». Аналягам чырвонаскурых у расейскім фальклёры зьяўляецца каўкаскі джыгіт, чый вобраз сынанімічны паняцьцям вайна, помста, падман. Антыподам злых абрэкаў у вачах расейцаў зьяўляецца талерантны масквафільскі беларус. Якраз гэтаму іміджу беларусаў наканавана дамінаваць у Астанкіне.

З нашага боку ёсьць шанец разьбіць стэрэатыпную тэлекарцінку, выйсьці за межы ралевых гульняў для мэдыяў, падначаленых капрызам расейскіх масавых мітаў.

Пагроза гуманітарнай катастрофы на Каўказе

Працяг са старонкі 1.

Інгускі кардон зусім не прыкрыты, у адрозьненьне ад іншых межаў Чачэніі. Такое ўражаньне, што Расея наўмысна выціскае ўцекачоў у Чачэнію.

У Дагестан расейскія кардоны паводле афіцыйных зьвестак прапусьцілі толькі 3104 чалавекі, у якіх ёсьць сваякі ў гэтым краі. Паводле неафіцыйных, расейскія кардоны дзяруць з уцекачоў вялікія грошы за магчымасьць перайсьці мяжу.

Маштаб апэрацыі і характар прапаганды, што разгортваецца на маскоўскім тэлебачаньні, выклікаюць усё большую трывогу ў сьвеце. Дзярждэпартамэнт ЗША выказаў заклапочанасьць сытуацыяй вакол Чачэніі і заклікаў Маскву праявіць стрыманасьць. Фінляндыя ў заяве ад імя Эўрасаюзу гаворыць пра пагрозу гуманітарнай катастрофы і засьцерагае Расею.

Сусьветная грамадзкая думка з трывогай назірае за тым, як Расея спрабуе сьціснуць пятлю вакол Чачэніі. Тое, што робіцца, вельмі падобнае да плянаў этнічнай чысткі, вынішчэньня чачэнцаў. Найбольш уплывовыя газэты сьвету называюць паводзіны Расеі непрымальнымі, а шавіністычна-мілітарысцкую хвалю ў Расеі — трывожным, асабліва перад выбарамі, фэномэнам. Стрыманасьць прэзыдэнта Масхадава, наадварот, выклікае сымпатыю.

Між тым адзін з найбольш уплывовых расейскіх палітыкаў, генэрал Лебедзь, у інтэрвію французкай газэце *Figaro* заявіў, што ён «амаль упэўнены»: выбухі ў Маскве й Валгадонску, якія сталі намінальнай падставай для антычачэнскай кампаніі, былі арганізаваныя ўладнымі структурамі Крамля, а іх выканаўцамі былі бандыты і наймиты без нацыянальнасьці.

Выбухі адбыліся неўзабаве пасьля таго, як Пуцін зьмяніў у расейскім «Белым доме» замяккага Сьцяпашына. Паводле Лебедзя, спроба разьвязаць вайну на Каўказе — проста праваКацыя тых, хто спрабуе навязаць краіне жах і тэрор і такім чынам уплываць на вынікі выбараў.

Барыс Тумар

Клопат пра продкаў

Літва дамагаецца, каб Расея даглядала магілы людзей, якіх у часы Сталіна (1940—1952) павывозілі з тэрыторыі цяперашняй Літоўскай Рэспублікі і парасстрэльвалі ў Расеі. Такіх людзей налічваюць каля 300 тысячаў. Займаецца гэтым літоўскае міністэрства культуры. Яно рыхтуе праект адмысловае дамовы для міжурадавай літоўска-расейскай камісіі. Пра гэта ўсё ў чацьвер распавёў сябра Сэйму Антанас Стасішкіс, які ўзначальвае камісію па правах і справах удзельнікаў супраціву акупацыйным рэжымам і асобаў, што пацярпелі ад акупацыі. Выступ Стасішкіса навёў на такія думкі: колькі было пацярпелых беларусаў; эх, такую б камісію нам, бо ў нас нават лічба тых рэпрэсаваных пад сакрэтам; ці існуе ў расейцаў такое паняцьце як догляд могілак. Бо іншы раз і ў Беларусі бачыш занядбаныя або безаблічныя клады, што койкі ў казарме. Літоўцы ж гэтую справу ведаюць сьвята — тут на могілках зазвычай найлепшыя мясьцінкі ў гарадох і вёсках. Продкаў любяць.

На беларускі час

31 кастрычніка час у Літве пераводзіць ня будуць. Пажыўшы два гады ў цэнтральнаэўрапейскім часавым пасе (разам з Польшчай і Чэхіяй), краіна вернецца да свайго «прыроднага» часу і будзе жыць разам зь Беларусяй — паміж Масквой і Варшавай.

Зноў пра Моніку Лявінскі

Гэтай вясной на першага красавіка ў маскоўскім «Огоньку» была цэлая споведзь нейкага чалавека зь Бешанковічаў, які выдаваў сябе за роднага дзядзьку Монікі — каханкі Клінтана. Праўда, часопіс папярэджваў, што друкуе гэта на правах 1 красавіка. Вось жа літоўцы ўзяліся за гэтае дзела больш грунтоўна — палезьлі ў архівы і высьветлілі, што дзед Монікі па маці — Самуэль Віленскі, зьбег напярэдадні другой сусьветнай вайны ад сталінскага тэрору. У амэрыканскіх архівах ёсьць ягоныя дакумэнты пра тое, што нарадзіўся ён у 1904 годзе ў Троках. Літоўскія архівісты кінуліся шукаць у троцкіх архівах і ў кнігах жыдоўскіх суполак, але ніякага Віленскага не знайшлі — ні там, ні дзе-кольвек у Літве. Значыць, зрабілі выснову, ён сам схлусіў пра Трокі, калі падаваў зьвесткі на амэрыканскае грамадзянства. Тады ўзяліся за сям'ю дзеда Монікі па бацьку, тых, што ўцяклі ад Гітлера зь Нямеччыны. Іхнае прозьвішча яшчэ цікавейшае — Палешукі. Жонка нашага Самуэля Броня Паляшук з гэтай сям'і ў дакумэнтах казала, што ейны мужык паходзіць з Расеі, але канкрэтнага гораду не ўказала. Тады архівісты зьвярнуліся да «Слоўніку жыдоўскіх фамільяў Расейскай Імпэрыі» і знайшлі, што нашы Віленскія паходзяць з Рэчыцы. Праўда, прозьвішча іхнае сьведчыць пра яшчэ ранейшае паходжаньне зь Віленшчыны. Далей усё было проста. Самуэль і Броня нарадзілі ў 47-м годзе Марцю — будучую матку Монікі, якая зьявіцца на сьвет праз 25 гадоў. А што там было пасьля, вы ўсе добра ведаеце ці, прынамсі, здагадваецеся.

Фота С.Віленскага зь ягоных дакумэнтаў на амэрыканскае грамадзянства.

Ліцьвін

Падрабляюць нашу гарэлку

«Наша Ніва» ня раз пісала, што Літву запаланіла беларуская гарэлка, якую прывозяць кантрабандай. Набраў якога «Панскага двара» па паўдаляру, а прадасі ў Вільні па два з паловай, бо свая заводзкая гарэлка ў Літве каштуе ажно пад пяць даляраў за паўлітру. Вось жа апошнім часам літоўскія ўлады надта сталі ганяць кантрабандыстаў — ажно дзесяць крымінальных справаў завялі. Дык мясцовыя «бізьнясьмены» вось што прыдумалі — сталі ў беларускія бутэлькі разьліваць звычайную літоўскую самагонку. Празь мяжу перавозіць, рызыкаваць ня трэба, а прыбытак яшчэ большы. Вось што значыць марка беларускай гарэлкі — надзейная абарона і аўтарытэт для таннага тавару.

RADIO FREE EUROPE · RADIO LIBERTY

БЕЛАРУСКАЯ СЛУЖБА РАДЫЁ СВАБОДА

Беларускія перадачы Радыё Свабода выходзяць у эфір тройчы на дзень:

• ПЕРШАЯ ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
18.00-19.30 паводле менскага часу (15.00-16.30 UTC)
7295 кгц (41.12 м)
9610 кгц (31.22 м)
11725 кгц (25.59 м)
15565 кгц (19.27 м)

• ДРУГАЯ (АБНОЎЛЕНАЯ) ВЕЧАРОВАЯ ПЕРАДАЧА
22.00-23.30 паводле менскага часу (19.00-20.30 UTC)
6105 кгц (49.14 м)
9535 кгц (31.46 м)
9750 кгц (30.77 м)
11865 кгц (25.28 м)

• РАНІШНЯЯ ПЕРАДАЧА
(ПАЎТОР ПЕРШАЙ ГАДЗІНЫ ДРУГОЙ ВЕЧАРОВАЙ ПЕРАДАЧЫ)
6.00-7.00 паводле менскага часу (3.00-4.00 UTC)
6065 кгц (49.46 м)
7295 кгц (41.12 м)
9635 кгц (31.14 м)
9750 кгц (30.77 м)

У праграме:
... навіны зь Беларусі і ўсяго сьвету, правы чалавека, апазыцыя, улада, родная мова, эканоміка, мэдыцына, культура, гісторыя, эміграцыя...

Спэцыяльныя перадачы:
... Праскі акцэнт, Вострая Брама, Блізкая Эўропа, Беларускі інтэрнэт (нд), Ад панядзелка да панядзелка (пн), Гаўдэамус, Беларускія раздарожжы (аўт), Неабжытая спадчына, Паштовая скрынка 111 (чц), Новае пакаленьне (пт), Сымбаль веры (сб)...

Апрача таго, усе нашыя перадачы перадаюцца на сярэдняй хвалі 521 м (576 кгц)

«МЕЧ У КАМЯНІ», «БАЛТО»,«АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ», «ПРЫГАЖУНЯ Ў СОННЫМ ЛЕСЕ» — мультыплікацыйныя фільмы, дубляваныя па-беларуску акторамі вядучых менскіх тэатраў. **«ЕХАЎ КАЗАЧНІК БАЙ», «ЦІК-ТАК ХОДЗІКІ», «БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ», «СТОЙКІ АЛАВЯННЫ САЛДАЦІК + КАЛІФ-БУСЕЛ»** — аўдыёкасэты з запісамі казак, калыханак, песьняў для маленькіх беларусаў.

Кошт відэакасэты — 900 тыс. руб., кошт аўдыёкасэты — 350 тыс. руб. Касэты можна атрымаць, пералічыўшы грошы звычайным паштовым пераказам на рахунак: ЗАТ «Сотвар» р/р 3012000000195 у філіі 506 ААБ «Беларусбанк», код 809. У графе «Для пісьмовага паведамленьня» напішыце, якую касэту Вы замаўляеце. Менчукі! Зьвяртайцеся на тэл.: 8 (017) 228-45-88.

Гуртам – зьніжка! Тэлефануйце!

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ЧЫТАЧОЎ У МЕНСКУ

Каб чытаць сьвежы нумар «НН» у дзень выхаду – у панядзелак – і пры гэтым эканоміць час і грошы, аформіце падпіску ў бліжэйшым шапіку «Белсаюздруку», а атрымліваць газэту можна ў любым менскім газэтным шапіку.

Зь ліпеня 1999 г. падпіску «да запатрабаваньня» прымаюць 32 газэтныя шапікі. Менскі «Белсаюздрук» гарантуе выдачу газэты па падпісным абанэмэнце ў дзень выхаду газэты, а таксама захаваньне не забраных вамі асобнікаў праз увесь падпісны пэрыяд.

Кошт падпіскі на «НН» на месяц (з кастрычніка) – **192 000** руб. (4 нумары ў месяц, газэта выходзіць на 12 старонках). Падпіска «да запатрабаваньня» прымаецца да 23 дня перадпадпіснога месяца ў крамах і шапіках «Белсаюздруку» г. Менску. Даведацца і высьветліць няясныя пытаньні можна па тэл. 227-88-41 у спадарыні Натальлі Сьвятохі.

Звычайная падпіска па краіне на IV квартал 1999 году.
Кошт на 1 месяц - 212 000 рублёў, на 3 месяцы - 636 000 рублёў.

НАША НІВА

Ніжэй мы падаем сьпіс пунктаў, дзе можна падпісацца й забіраць газэту:

1. Кастрычніцкі пункт падпіскі, вул. Жукоўскага, 5, к. 1
2. Партызанскі пункт падпіскі, вул. А.Кашавога, 8
3. Першамайскі пункт падпіскі, пр. Ф.Скарыны, 113
4. Фрунзенскі пункт падпіскі, вул. Рам. Слабада, 9
5. Крама № 1 вул. Жукоўскага, 5
6. Крама № 2 пр. Ф.Скарыны, 44
7. Крама № 3 пр. Ф.Скарыны, 76
8. Крама № 4 вул. Леніна, 15
9. Крама № 6 вул. Філімонава, 1
10. Крама № 7 вул. Якуба Коласа, 69
11. Крама № 8 вул. Сурганава, 40
12. Крама № 9 пр. Ракасоўскага, 140
13. Крама № 10 вул. Асіпенкі, 2
14. Крама № 11 пр. Пушкіна, 77
15. Крама № 12 вул. Кіжаватава, 80
16. Крама № 13 вул. Каліноўскага, 82, к. 2
17. Крама № 14 вул. Валадарскага, 22
18. Крама № 15 вул. Танкавая, 16
19. Крама № 16 вул. В.Харужай, 24
20. Крама № 17 вул. Някрасава, 35
21. Крама № 18 ст. м. «Плошча Перамогі»
22. Крама № 19 пр. Машэрава, 51, к. 1
23. Крама № 20 вул. Ясеніна, 16
24. Крама № 21 станцыя мэтро «Пушкінская»
25. Крама № 23 вул. Славінскага, 39
26. Крама № 24 вул. Жылуновіча, 31
27. Шапік № 34 гатэль «Менск», пр. Ф.Скарыны, 11
28. Шапік № 136 ст. м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі Фізкультуры
29. Шапік № 187 гатэль «Беларусь», вул. Старажоўская, 15
30. Шапік № 262 гатэль «Плянэта», пр. Машэрава, 31
31. Шапік № 78 гатэль «Юбілейны», пр. Машэрава, 19
32. Крама №25 вул. К.Маркса, 21

ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 63125

І БЫЛА НАПАЧАТКУ ВЁСКА...

Віктар ШНІП

Вёска 1. Сельскае паселішча. *Палеская вёска. Вёска, дзе была школа, спадабалася мне — невялікая, з адной толькі вуліцай, і ўся нібы замаскіраваная ў зеляніне.* Кавалёў.

2. Сельская мясцовасьць. *Паехаў працаваць на вёску // Жыхары вёскі; сялянства, вясковае насельніцтва. (Мужык) — Хлопчык як пачне іграць на дудачцы, дык уся вёска зьбягаецца слухаць.* Якімовіч. *Зь вёскі змываць дакастрычніцкі бруд — Задача мая ўдарная.* Крапіва.

Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Пад рэд. К.К.Атраховіча (Кандрата Крапівы). Т. 1. — Менск, БСЭ, 1977.

1. Вёска пачынаецца...

Для гараджаніна вёска пачынаецца з аўтавакзалу. На прыпынку вялікія сьметніцы, але ўсё сьмецьце ў іх не зьмяшчаецца. І топчуцца людзі па сьмецьці, углядаючыся ў горад, ня бачачы гораду. Пад'яжджае патрэбны аўтобус. І людзі яго амаль штурмуюць, як татара-манголы Разань. Аўтобус рыпіць, трашчыць, але стаіць, бо жалезны. Кожны мае квіток. Хто — зь месцам, а хто — і без. І заўсёды знойдзецца чалавек з вострым языком, які ня можа каб не палаяцца.

Дарога да вёскі доўгая, як на іншую плянэту. У аўтобусе душна, пыльна. Пахне потам і перагарам. Нехта ўсю дарогу чытае газэту, нехта дрэмле. Моладзь жартуе, хоць вясёлага нічога няма ні ў аўтобусе, ні за шыбамі.

Нарэшце вёска. Пакладзены амаль на балота асфальт — цывілізацыя. На прыпынку вясковыя кабеты — чакаюць гарадзкіх навін, як зусім нядаўна чакалі машыну з хлебам. Хлеб прывозяць два разы на тыдзень. І адразу разьбіраюць. Раней куплялі па пяць, па дзесяць буханак — кармілі сьвіней. Цяпер толькі для сябе — дорага. Маглі б і самі пячы хлеб, але многія развучыліся, ды й няма мукі ў магазіне. Можна змалоць, ды нічога са збожжа самі ня сеялі. Ісьці красьці ў калгас? Ня кожны адважыцца, і крадзенае ўсё-ткі — крадзенае...

Выходзіш з аўтобусу, нібы трапляеш у жыцьцё, якім цывілізаваны сьвет даўно ўжо не жыве. Але гэта наш сьвет, і таму мы такія, якія ёсьць...

2. Тэлефон міліцыі — 02

«У сваім доме пайшла на вісельню жыхарка вёскі Грыцкаўшчына Ракаўскага сельсавету Грышалевіч. А вось 22 жніўня вечарам у доме грамадзянкі А.Загорскай зь Вялікай Дайнавы раптоўна памёр невядомы грамадзянін».

«У ноч на 28 жніўня невядомыя сарвалі шыфэр з гаражу жыхара райцэнтру В.Зіноўскага і ўкралі акумулятар, аўтамагнітолу, 20 літраў бэнзыну і іншыя рэчы. Тэлевізар чорна-белага адлюстраваньня ўкрадзены ў грамадзянкі вёскі Навасады В.Урбановіч. У пэрыяд з 21 па 24 жніўня, узламаўшы ўваходныя дзьверы, выкралі тры пярсьцёнкі і 110 даляраў ЗША з кватэры грамадзяніна Шарапы».

«В.Зайцаў, псыхічна хворы са Стаўпецкага дому-інтэрнату, разьбіў шкло, сагнуў мэталічныя пруты і такім чынам трапіў у магазін, дзе на добрую суму зьеў чакалядак. Сыгналізацыя ня «выдала» злодзея, бо аказалася няспраўнай».

«У дзьве гадзіны ночы ў мінулую нядзелю В.Філіповіч залез у хлеў да свайго суседа А.С. і стаў «паляваць» на кур. Гаспадар спаў чуйна і неўзабаве нечакана для злодзея зазірнуў у куратнік. Завязалася бойка. Бакі адзін аднаму суседзі, відаць, натаўклі добра, бо ў 13 гадзін раней судзімага В.Філіповіча знайшлі дома мёртвым».

«Застаўся бяз транспарту жыхар вёскі Шуловічы Г.Чэрнік: нехта ўкаціў яго матацыкаль «Мінск» проста з двара С.Матуса ў Бомбалах, прычым сярод белага дня».

Так было сем гадоў таму. Сёньня мала што зьмянілася, і ня ў лепшы бок. Але жывем...

3. Вёска і тэлевізар

У большасьці вёсак няма Храму, але ўсё ж хапае вернікаў. Праўда, і за камуністычных часоў людзі верылі, але часьцей за ўсё жывым галовам, якія складна гаварылі ў тэлевізары. Але тэлевізараў асабліва не было. Не было за што купіць. Сёньня тэлевізар для вяскоўца — не навіна, і ён ведае, што і ў колькі будуць паказваць. Дзякуючы тэлевізару, людзі вераць у тое, што ў далёкім замежжы ўсё дрэнна, а ў нас поўны росквіт. Пасьля старшыні калгасу тэлевізар для большасьці вяскоўцаў — самы аўтарытэт. Вясковыя кабеты палюбілі мыльныя сэрыялы, якія ім добра прамываюць мазгі ад праблемаў, якіх хапае ня толькі на працы, але і ў хаце. Цячэ страха. Няма чым і за што адрамантаваць. Ды й няма каму. Стары не палезе на хату, а маладому трэба напачатку пляшка. А дзе яе ўзяць? Самагонкі не нагоніся. Цукар дарагі. Да ўсяго — трэба вазьці з гораду. Сам не паедзеш — далёка, і ня кінеш гаспадарку. А гаспадарка вялікая. Сьвіньні, карова, куры, качкі, сабака... Усе хочуць есьці. А тэлевізар есьці ня просіць. І глядзяць вяскоўцы ў гэты «яшчык», і нарадзіцца яны могуць і ў вёсцы. Але выхоўваюцца ў горадзе. Менавіта вэртыкальная сьвядомасьць дазваляе чалавеку прагрэсаваць і ствараць тое, што называецца цывілізацыяй.



Фота Анатоля Клешчука

Нездарма сталічныя дэпутаты любяць балятавацца ў закінутых вясковых акругах. Вэртыкальнага чалавека ня так проста сагнуць.

Вось толькі ў кантэксьце беларускай рэальнасьці вэртыкальных людзей адзін адсотак з усіх, хто лічыцца гараджанамі. Таму што беларускія гарады насяляюць у большасьці гарызантальныя людзі. Яны пагалоўна ўмеюць саджаць бульбу і вырошчваць памідорную рассаду. Паглядзіце, як яны шчыруюць на лецішчах, зь якой асалодай закатваюць слоікі з кампотам! Трымаюцца за лапікі зямлі ў вазонах, на газонах... Наша сталіца цісьнецца да зямлі, угінаецца ў яе прысадзістымі каржакаватымі камяніцамі. Нават помнік Перамогі панізіўся на скрадзеныя пад час транспартаваньня невядома кім і нашто два фрагмэнты. Спальныя мікрараёны распаўзаюцца шэрымі бэтоннымі чарвякамі, яны нагадваюць плесьню, што харчуецца высмактанай зь мікралюдзей энэргіяй і часам.

У прыродзе чалавека — ствараць вэртыкаль.

Татэмны слуп, эгіпэцкая піраміда, славянскі курган... Як апатэоз — сучасны мэгаполіс. У Эдэме не было штучна створанай вэртыкалі... Ці значыць гэта, што цывілізацыя ўвогуле — паталёгія, штучнасьць? Хто ў такім выпадку мы, дзеці гораду, што ня ведаем, як садзіць бульбу?

Вышэйзгаданы эпізод пра нос Мікеляндж эльо вычытаны ў кнізе філёзафа Аляксея Лосева. Страшэнна мяне абуралі ягоныя «раскрыцьці». Так, Вэнэра Батычэлі, паводле Лосева, — прыклад зьмены ў мастакоў жаночага ідэалу, калі замест здаровай цялеснай кабеты, узгадаванай на беспэстыцыднай ежы прадмесьцяў, прыходзіць сухотная, рахітычная гараджанка... Я не магла дараваць шаноўнаму філёзафу такіх эпітэ-

ГОРАД — МЛЫН СЬВЯДОМАСЬЦІ

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Urbis at orbis urbs

УРРР-БС... Нешта «ўтробнае», вантробнае ў самім слове. Рыканьне неабдымнай пачвары, якая стравуе ў сваім чэраве мільярды разумных мікраарганізмаў, нібыта кіт — засмактаны планктон...

Эколягі называюць мэгаполісы чорнымі дзіркамі цывілізацыі. Від *Homo Sapiens* тут перавысіў адведзеную прыродай мяжу папуляцыі ў тры разы. Уключыліся мэханізмы рэгуляваньня — унутрывідавая агрэсія, падзеньне нараджальнасьці, зьніжэньне імунітэту, хваробы, небясьпечныя штукарствы... І чорныя дэмаграфічныя дзіркі мэгаполісаў засмоктваюць здольную да рэпрадукцыяў здаровую правінцыйную моладзь і асуджаюць на бясплённае згасаньне па інтэрнатах. Мая маці нейкі час працавала выхавацелькай у заводзкім інтэрнаце. Дасюль памятаю тужлівыя вечары танцаў (тады яшчэ не дыскатэкі), калі на радыёле «Сэрэнада» пракручвалі кружэлкі Ларысы Мондрус і аркестру Поля Марыа. Інтэрнатаўцы ў сініх ваўняных нагавіцах-клёш прыглядаліся да нешматлікіх сагнаных ім да пары дзевак — а раптам прыйшла якая «гарадзкая». Але прыходзілі зазвычай адны перасьпелыя інтэрнатаўкі.

УРБАНІЗАЦЫЯ. *1. Гістарычны працэс, зьвязаны з канцэнтрацыяй насельніцтва, эканамічнага і культурнага жыцьця ў буйных гарадах.*

УРБАН, папа Рымскі... Іх, Урбанаў, здаецца, было некалькі. Ці ня папу з такім імем Бэнвэнута Чэліні дарыў свае забаўкі-шэдэўры, каб заручыцца падтрымкай найвышэйшай духоўнай улады пасьля ўчыненых вялікім ювэлірам паскудстваў? Найменшым зь якіх было разьбіцьцё носу вялікаму скульптару Мікеляндж элё Буанароці.

Праўда, наданьне носу Мікеляндж элё вытанчанай формы — зь якой ён і адбіўся ў люстэрку гісторыі — можа разглядацца як мастакоўская акцыя. Артэфакт.

А можа, я нешта блытаю, і нос Мікеляндж элё разьбіў нейкі іншы вялікі мастак?

Але вось што я дакладна блытаю — дык гэта пра папу Ўрбана. Зусім не яму дарыў Бэнвэнута свае бліскучыя цацкі і цалаваў у залатую пантофлю. Аказваецца, іх, папаў эпохі Бэнвэнута, было ажно два — Клімэнт II і Павал III. Першаму зь іх шалёны Бэнвэнута біў манэты, а другі ўпёк-такі майстра ў турму.

А вось пра папу рымскага Ўрбана — хаця б аднаго — я так нічога і ня ўспомніла... Затое Рым!.. Рым — горад гарадоў, горад-сьвет. Рымская імпэрыя... Імпануе найбольш фактам, што ўрэшце развалілася. Хто дзьве тысячы гадоў таму мог у гэта паверыць? Блюзьнерства... Празь пятнаццаць стагодзьдзяў Пэтрарка будзе хадзіць на развалінах Сусьветнага гораду, выкалупваць з друзу адбітыя мармуровыя канечнасьці багоў і гадаць, каму канкрэтна яны належалі... Сьмяцьцё Рымскай імпэрыі, якое зацерушыла ўсю эўрапейскую цывілізацыю. Сьмяцьцё гораду — ежа гісторыі. Менавіта на ім археолягі вырошчваюць свае самыя даставерныя міты.

УРБАНСКІ... Квадратна-мэталёвы камуніст зь фільму «Камуніст». Чалавек-плякат. Біцэпсы, трыцэпсы, сталёвыя сківіцы. Камуніст-Урбанскі будаваў сярод скіцкай стэпавай Расеі савецкі горад. Сюжэту ня памятаю. Памятаю толькі сцэну, калі ашалелыя ад плыні марксісцка-ленінскай інфармацыі і дармовай ламавой працы працавікі адмовіліся выйсьці з бараку валіць лес на пабудову сьветлай будучыні. І магутны Камуніст-Урбанскі рушыў выконваць сацплян сам. Аголены торс па-культурысцку напружваецца, вялізныя дрэвы трашчаць і валяцца вакол мужнага героя... Лесуны зь віскам шугаюць у дальнія кусты... Не, наконт лесуноў я зноў блытаю. Якія лесуны ў сацрэалізьме? Але прысаромленыя працавікі выпаўзьлі з бараку і пакорліва пабраліся за сякеры. Гэпі-энд.

Праўда, пры канцы Камуніста такі прыстрэлілі ворагі народу.

Урбанскі таксама загінуў. Не магу дэталізаваць, але трагічна і заўчасна, здаецца, пад час нейкіх здымак.

Гэта да таго, што людзі падзяляюцца на гарызантальных і вэртыкальных, а вэртыкальныя выхоўваюцца толькі ў горадзе. Не,



Фота Анатоля Клешчука

нарадзіцца яны могуць і ў вёсцы. Але выхоўваюцца ў горадзе. Менавіта вэртыкальная сьвядомасьць дазваляе чалавеку прагрэсаваць і ствараць тое, што называецца цывілізацыяй.

Нездарма сталічныя дэпутаты любяць балятавацца ў закінутых вясковых акругах. Вэртыкальнага чалавека ня так проста сагнуць.

Вось толькі ў кантэксьце беларускай рэальнасьці вэртыкальных людзей адзін адсотак з усіх, хто лічыцца гараджанамі. Таму што беларускія гарады насяляюць у большасьці гарызантальныя людзі. Яны пагалоўна ўмеюць саджаць бульбу і вырошчваць памідорную рассаду. Паглядзіце, як яны шчыруюць на лецішчах, зь якой асалодай закатваюць слоікі з кампотам! Трымаюцца за лапікі зямлі ў вазонах, на газонах... Наша сталіца цісьнецца да зямлі, угінаецца ў яе прысадзістымі каржакаватымі камяніцамі. Нават помнік Перамогі панізіўся на скрадзеныя пад час транспартаваньня невядома кім і нашто два фрагмэнты. Спальныя мікрараёны распаўзаюцца шэрымі бэтоннымі чарвякамі, яны нагадваюць плесьню, што харчуецца высмактанай зь мікралюдзей энэргіяй і часам.

У прыродзе чалавека — ствараць вэртыкаль.

Татэмны слуп, эгіпэцкая піраміда, славянскі курган... Як апатэоз — сучасны мэгаполіс. У Эдэме не было штучна створанай вэртыкалі... Ці значыць гэта, што цывілізацыя ўвогуле — паталёгія, штучнасьць? Хто ў такім выпадку мы, дзеці гораду, што ня ведаем, як садзіць бульбу?

Вышэйзгаданы эпізод пра нос Мікеляндж эльо вычытаны ў кнізе філёзафа Аляксея Лосева. Страшэнна мяне абуралі ягоныя «раскрыцьці». Так, Вэнэра Батычэлі, паводле Лосева, — прыклад зьмены ў мастакоў жаночага ідэалу, калі замест здаровай цялеснай кабеты, узгадаванай на беспэстыцыднай ежы прадмесьцяў, прыходзіць сухотная, рахітычная гараджанка... Я не магла дараваць шаноўнаму філёзафу такіх эпітэ-

ім здаецца, што яны бачаць сьвет і да ўсяго разумеюць, на чым сьвет стаіць. На двары канец XX стагодзьдзя, а вёска ўсё жыве яшчэ недзе ў яго самым пачатку, хоць і глядзіць тэлевізар...

4. Гной

Што вёска бяз гною? Нішто... А гною хапае. І здавалася б, што ўсё павінна расьці і квітнець. Ды не. Нечага бракуе да гною. Гаспадар ведае чаго. Але веданьня аднаго мала. І наагул гной у вёсцы — гэта як жывая вада ў казцы. Вось толькі мы, гараджане ў першым пакаленьні, як той «распанелы» Максім Гарэцкі, грэбуем бацькоўскай лазьняй і шчыра зьдзіўляемся, чаму, ну чаму нельга пакласьці праз той гной кладачкі?

5. Мы ўсе з хатаў

Амаль усе нашы больш-менш вядомыя пісьменьнікі выйшлі зь вясковых хат. Выйшлі з хатаў і не дайшлі да гораду, які стаіць ня недзе ў Азіі, а ў цэнтры Эўропы. Адно добра, што мы ўжо забыліся пра лапці, у якіх, праўда, некаторыя яшчэ бачаць вяскоўца. А вясковец даўно ўжо ня той. Ён умее ня толькі пасадзіць і выбраць бульбу, але й разьбіраецца ў далярах.

Мы выйшлі з хатаў. І стаяць цяпер тыя хаты, амаль нікому не патрэбныя, бо мы, маладыя, іх не будавалі і для нас яны цяпер — як для матыля пусты кокан...

6. Аб'яднаньне

Маім аднавяскоўцам пашанцавала — у свой час яны асабіста ведалі аднаго зь вялікіх апазыцыянэраў Сямёна Шарэцкага. Ён узначальваў суседні калгас «Чырвоная гвардыя». І вось неяк у галаву Шарэцкага прыйшла думка аб'яднаць свой калгас з нашым, каб разам ісьці да камунізму. У нашых калгасьнікаў быў вялікі пярэпалах — людзі не разумелі, для чаго ўсё гэта рабіць, калі ім і так жывецца нядрэнна. Гадоў пяць ішлі размовы пра аб'яднаньне, але нічога не атрымалася. Ды ўсё ж, як кажуць, не цяпер, дык у чацьвер, аб'яднаньне адбылося, але ўжо не з «Чырвонай гвардыяй», а з саўгасам «Залескі». Аб'ядналіся без валакіты — з «Залескага» зьехаў старшыня, а на яго месца ніхто не захацеў ісьці...

7.

Вёска — гэта пупавіна, якую адрэзалі і выкінулі. І ляжыць яна цяпер сярод лясоў і палёў, сярод лугоў і балатоў забытая, але яшчэ цёплая і ня зьедзеная сабакамі...

Вёска — гэта пчаліны вулей. А Пчаляр пакуль што не нарадзіўся...

Вёска — гэта балота. І трапляюць у яго людзі6 і не вяртаюцца...

Вёска — гэта сон, што прысьніўся вандроўніку, які ідзе з варагаў у грэкі...

Вёска — гэта тое, што засталося ад вялікага княства...

Вёска — гэта магіла, у якой існуе жыцьцё...

8. Але...

Іду я па вёсцы, як праз сваё мінулае. Мне сумна, бо я тут амаль чужы. Мяне ўжо амаль ніхто ня ведае, як і я амаль нікога ня ведаю. Але гэта мая вёска, і яе з усімі яе «фокусамі» я люблю, як любяць самога сябе...

І была напачатку вёска... ■

таў у адносінах да вобразу, які мне «адгукаецца». Прайшло досыць шмат часу, каб я зьмірылася з прызнаньнем паталёгіі Батычэлевай Вэнэры, гадаванкі сярэднявечнай камяніцы без ватэрклязэту. Я ня ведала, што мне давядзецца вучыцца ў жонкі шаноўнага Лосева, Тахо-Годзі, і слухаць у выкананьні яе раскацістага кантральта «Іліяду» на старажытнагрэцкай. Дык вось, у Тахо-Годзі ёсьць думка, што чалавеку любога дэмакратычнага грамадзтва ўласьціва міта-рытарычнае мысьленьне, якое зьяўляецца падмуркам унутрыпсыхічнага заняволеньня. Менавіта таму дэмакратыя, што перамагае на хвалях высокіх духоўных ідэалаў і энтузіязму, аказваецца бясплённай, няздольнай да разьвіцьця і ўвасабленьня сваіх дэклярацыяў. Нездарма ж такая зьява, як контракультура, існуе і ў самым дэмакратычным грамадзтве, і зь ня меншым рэзанансам і жарсьцю.

Толькі ў горадзе магчымае існаваньне контракультуры, андэграўнду. Таму што для шматслойнай культуры мусяць існаваць паверхі.

Між намі і зямлёю мусяць існаваць паверхі. Дзіўна адчуваю сябе ў вясковых дамах і на чужых лецішчах (свайго ня маю).

УРБАНІЗМ. Накірунак архітэктуры XX ст. Сфармуляваў Лё Карбюзье. Цытую з памяці, але гэта практычна ўся інфармацыя на тэму, бо архітэктурнае аддзяленьне сканчала вельмі даўно...

УРБАНІЗАЦЫЯ. *2. Пашырэньне рысаў, асаблівасьцяў, уласьцівых гораду, на вясковае жыцьцё.* (Гэта я зноў, як ты разумееш, шаноўны чытачу, залезла ў слоўнік.)

Вёска глядзіць дзясяткамі вачэй, цікуе, унармоўвае, абмяркоўвае, судзіць і прысуджвае. У горадзе ты — вольны, калі гэта твой горад. Бо цябе ніхто ня ведае. Ты паскудзіш выпадковаму чалавеку з упэўненасьцю, што ніколі больш яго не сустрэнеш. Ты — такая маленькая інфармацыйная адзінка, што не ўспрымаесься асобна. Таму ў горадзе гарадуюцца індывідуалісты.

УРАБОРАС — зьмяя, што зьядае свой хвост. Сымбаль альхімікаў і пэрсанаж скандынаўскай міталёгіі. Калі настане зьмярканьне багоў, зьмей Ураборас праглыне зямлю, а воўк Фрэнір — сонца. Горад-Ураборас таксама зьядае сам сябе, вечна заключаны ў кальцавую дарогу. Ён расьце, растуць яго могілкі, растуць яго звалкі, каналізацыйныя трубы.

У маёй тэорыі літаратурнага беларускага міту горад, як асяродзьдзе існаваньня абагуленага героя — прадстаўніка нацыі, займае ў сучаснай паэзіі месца традыцыйнай міталягемы балота, няпэўнага, з прыхаванымі бездонямі, варожымі духамі... І натуральным месцам жыцьця.

Мы застаемся людзьмі на балоце. Бо наш горад, як наша балота.

У адрозьненьне ад пчолаў, тэрмітаў ды іншай інсэкты, існаваньне ў сумежных ячэйках разьядноўвае *гома ўрбаніс.*

У Эдэме была натуральная вэртыкаль — сувязь з Айцом Нябесным.

Штучна створаная вэртыкаль пасьляэдэмскага чалавецтва — або закліканая замяніць тую, натуральную сувязь зь небам, або палегчыць яе аднаўленьне? ■

Тацяна СЬНІТКО

INDEPENDENZA[7]



ПАДАРОЖЖА БЕЛАРУСКІ НА МАЛЬТУ

Бронзавая дзяўчына лёгкалёгка бяжыць на бронзавых хвалях проці ветру. Яна ўскідвае рукі над галавой — і ў іх трымціць, як ветразь, ускраек нябёсаў.

Independenza, мальтыйская статуя Свабоды, сапраўды нагадвае Грынаў пэрсанаж — Фрэзі Грант. Гэта зусім не грандыёзны, паводле нашых мерак, манумэнт, але ён — помнік Незалежнасьці. Напачатку я доўга не магла асэнсаваць дзіўную рэч: чаму сярод мноства тутэйшых помнікаў даўніны менавіта дзяўчына, што «бяжыць па хвалях», адклалася ў маёй сьвядомасьці, як мой асабісты сымбаль Мальты. Рэч ня ў тым, што краіне-кропачцы вельмі пасуе Грынаў сымбаль. Рэч у тым, што міжволі вылучыць з сотняў помнікаў Вобраз Волі можа, напэўна, толькі беларус, якому *Independenza* на плошчы можа толькі сьніцца.

Да бронзавай дзяўчыны ня водзяць экскурсіяў — я заўважыла яе здалёк, з гарадзкога аўтобусу. Цікава, якога памеру помнік Незалежнасьці будзе стаяць у Менску?

Мальта атрымала незалежнасьць 23 верасьня 1964-га. На сьвяткаваньне гэтай даты ў Валету іншы раз прыяжджае сама ангельская каралева. Ейны прыезд лічыцца за гонар. Гэта элемэнт урачыстасьцяў. І гэта пры тым, што менавіта брытанская карона панавала на Мальтыйскіх выспах 164 гады! Але калі вы скажаце, што Мальта паўтара стагодзьдзя была калёніяй, чакайце імгненнага абвяржэньня з боку мясцовага жыхара. «Прабачце, — ветліва скажа любы мальтыец, — мы проста былі пад ангельскім пратэктаратам». За тыдзень я наслухалася гісторыяў аб гераічнай барацьбе вольналюбівага народу Мальты супраць розных акупантаў — ад турэцкіх султанаў да Мусаліні, але пра нейкую барацьбу з ангельскай мэтраполіяй — ані слова.

Я спрабавала ўявіць, як Ельцын з Пуціным едуць 27 ліпеня ў Менск віншаваць нас, былых сатэлітаў Масквы. І дзякавала Богу, што бачу Менск на эўрапейскай тэлевізіі толькі ў прагнозе надвор'я. Значыць, яшчэ горш ня стала, і ўсе жывыя. Пасьля ж сюжэтаў пра Валгадонск ці сяло Карамахі (яны ўвесь час ішлі першым радком) шматлікім турыстам-расейцам можна было толькі спачуваць. Масквічы, што ехалі з намі на тую ці іншую экскурсію, пыталіся адзін у аднаго: «Хто наступны?»

Вялікая Брытанія, адпусьціўшы на волю маленечкую Мальту, здабыла самы каштоўны набытак — ейную сымпатыю. Тым самым застаўшыся Вялікай.

Прэзыдэнты і рыцары

З 1921 па 1976 год парлямэнт Мальты засядаў у Палацы Габэленаў. Пазьней для захаваньня каштоўнасьцяў мастацтва тут было зробленае цьмянейшае асьвятленьне, а дэпутаты перайшлі ў іншую залю. Пад час экскурсіі турыстаў ветліва папрасіла адысьці на пару хвілінаў... ахова прэзыдэнта. Мы схаваліся за калёну й спрабавалі сфатаграфаваць. Але ў кадар замест спадара Гвіда дэ Марка (цяперашняга кіраўніка дзяржавы) прафэсійна патрапіў усьмешлівы твар галоўнага ахоўніка: «Я ж казаў — забаронена!»

Уліс

Мальтыйскі востраў Гоца называюць яшчэ Каліпса. Легенда кажа, што тут жыла ў пячоры німфа Каліпса, дачка Атляса, якая сем гадоў утрымлівала Адысэя, выкінутага на бераг пасьля крушэньня карабля. Німфа закахалася ў вандроўніка й хацела ажаніцца зь ім, паабяцаўшы за гэта несьмяротнасьць. Аднак пасланец алімпійскіх багоў Гермэс прынёс Каліпсе патрабаваньне Зэўса адпусьціць Адысэя дахаты, да вернай Пэнэлёпы. Німфе давялося падпарадкавацца.

На Мальце я знайшла некалькі абэліскаў у памяць аб палеглых у другую сусьветную вайну ваярах. На высьпе Гоца помнік тых часоў — бронзавая постаць Хрыста, які бласлаўляе людзей на мірнае жыцьцё. «Абэліскам» жа на Гоца клічуць каменную стэлу ў памяць аб самай невайсковай падзеі — падвядзеньні да мястэчка Вікторыі пітной вады ў XIX ст. двума брытанскімі губэрнатарамі. На самай жа высокай гары выспы стаіць крыж з выявай Хрыста, які не пакутуе, а нібыта паказвае падарожнікам дарогу ў розныя бакі.

Ёсьць на Мальце і помнікі савецкага ўзору. Першы — на ўскрайку Сьлімы, бізнэсовага цэнтру краіны. Гэта мясцовыя «работнік і калгасьніца». Зрэшты, ня больш падобныя да свайго правобразу, чым крохкая Independenza — Фрэзі Грант — на амэрыканскую Статую Свабоды. Ніякіх сярпоў з малатамі, проста вытанчаныя пралетар і пралетарка, абняўшыся, паволі крочаць у сьветлую будучыню. Нам патлумачылі, што помнік узьвялі тут у 60-я гады пад час павароту палітыкі на ўмацаваньне сяброўства з сацлягерам.

Другі манумэнт — на ўзьбярэжжы ў Валеце — сымбалізуе канец халоднай вайны і не ўяўляе сабой нічога адметнага, акрамя даты й падзеі, у гонар якіх гэты слуп пастаўлены. 1989 год, сустрэча на Мальце прэзыдэнтаў М.Гарбачова і Р.Рэйгана.

Землякі

На «вялікім» востраве Мальце (а краіна зь некалькіх астраўкоў) — 37 населеных пунктаў, зьвязаных між сабой 45-ю аўтобуснымі маршрутамі. Усе шляхі на востраве вядуць да вялікага фантану ў Валеце.

Мальтыйцы, заўважаеш ты, толькі дзеля замежнікаў пераходзяць на ангельскую мову — большасьць карыстаецца сваёй. Калі вымаўляеш словы з тым правільным ангельскім вымаўленьнем, якому вучылі ў школе й ВНУ, яно імгненна выдае ў табе замежніка. Тутэйшыя вымаўляюць *hotel* як «отэль» і *three* як «тры». Прычына простая: уплывы італьянскай фанэтыкі. А гук «к» — зь нейкім арабска-чачэнскім гарлавым прыдыханьнем. Мальтыйская мова мае рысы ангельскай, арабскай, італьянскай і старажытнай фінікійскай. Вуліца — ня *street*, а *triq*. Плошча Незалежнасьці — *Piazza Independenza*. Вялікі дзякуй — «грацыя хафна». Літара *H* у іх мае дзьве гарызантальныя рысачкі.

На выспах давялося сустрэць даволі шмат землякоў з Цэнтральнай Эўропы. Шмат хто жыве паміж Мальтай і сваім домам. Працуюць. Алёна з Кіева — турагентам; Уладзіслаў зь Піцеру і Дзіма з Адэсы водзяць караблі. 13 гадоў жыве на Гоца замужам Яна. Возіць экскурсіі. Даніэл з Румыніі працуе ў італьянскім рэстаране. Даніэл гаворыць з намі па-ангельску, але ён — адзіны чалавек, які на маё «Добра» замест «о'кей» спытаў: «Вы з Украіны ці зь Беларусі?»

Усе «тутэйшыя» суайчыньнікі скардзяцца на праблемы з консульствамі сваіх краінаў, якія адсылаюць уласных грамадзянаў падаўжаць пашпарты з Валеты ў далёкі Рым.

Зь першых крокаў на Мальце мяне цікавіла, што думаюць і што ведаюць тут пра экзатычную паўночную краіну *Belarus*. Мальтыйскія мытнікі ня ведалі нічога. Але калі я вымавіла назву роднай сталіцы, ажно чацьвёра хорам выгукнулі: «Дынама-Менск»!!! — і агляд рэчаў для нас скончыўся. Рэч у тым, што некалі наша каманда гуляла з мальтыйцамі. ■

Цяжка ўявіць такі сьвет і лад, у якім жывуць адно лагодныя людзі. Лагодныя й задаволеныя адно адным. Мроі пра ідэальныя «залатыя часы» ў гісторыі нацыі ці дзяржавы — толькі мроі. Культурныя здабыткі і адкрыцьці, што выпярэджваюць час, — вынік дзейнасьці розных людзей, у тым ліку і тых, якіх уперад несла ліха. Чалавек з аднолькавай гатовасьцю прымаў і прымае дасюль як сьветлыя вяршыні, так і змрочныя глыбіні сваёй натуры. Складаныя выбар і змаганьне ці кампраміс паміж імі — патаемная справа асобы. Зьмяняюцца краявіды і ўмовы існаваньня, руйнуецца старое і будуецца новае жыцьцё на новы плян і манер, але не сканчаецца барацьба ўнутры чалавека, не зацягваецца тая расколіна, што прымушае нябачныя сілы ладзіць шалёныя скокі з аднаго берагу на другі.

Якімі адвечна аднолькавымі
былі праявы любові
і якая разнастайная палітра
праклёнаў!
Э.М.Рэмарк

ЛАЯНКА, АБРАЗЫ, ЛІХАДЗЕЙСТВА

у штодзённым жыцьці нашых далёкіх продкаў

Сярэднявечная вёска ці места рэдка калі абуджаліся пасьля ночы ва ўрачыстай маўклівасьці ранку. Бывала рознае.

Гэтак жонка менскага залатара Раіна Людвікавая, «стоечы подле фортки у дому своего яко невеста спокойная, правом посполитым убеспеченая, никому ни в чом невинная...», і думаць ня думала, што «злотничок» Юры Гесь Немец, зьявіўшыся зьнянацку перад зьляканай кабетай, «словы неучстивыми доброй славе ее дотькливыми лжыл, сороматил, называючы ее *курвою* и грозечыся на нее сокиркою, мовил: иж дей не отрекаюся тебе, Людвиковая, тою сякиркою бити, а коли голову твою розрубити...» А калі ўбачыў самога Людвика Залатара, які выбег на паратунак жонкі, папярэдзіў абаіх: «тебе, Людвік и жону твою Раину, конечно коликольвек выбью з гультайми, же до смерти паметать мене будете...»

Іншы «герой», прыйшоўшы да сваёй ахвяры «до светлицы», «немалую филю будучы у дворы, *волал, фукал, грозил...*» «...и малжонку статечную и учстивого стану шляхецкого *машкарою* и неучстивою называл, и по двору не малый час як хотел ходил».

Шмат у каго здрыганулася сэрца ад крыку ўдавы-зямянкі Янавай Захарэўскай у той момант, калі яна, зірнуўшы ў вакно, пабачыла людзей «и вже на дворе труну с телом». Выбегшы на двор, няшчасная кабета «с плачем просила *на Бог живы*, абы тело небожсковского з двора ее не провадили и тым бы ее в роспач не приводили... неже бы ей для погребу тое тело мели вернути». Ліхія прыхадні, назьдзекваўшыся зь цела і беднай удавы «безбожне.., способом тыранским того тела налаявшы и насромотившы с просными словы проч его попхнели...», прыхапіўшы з сабой вялікую частку шляхецкай маёмасьці — адзеньне, тканіны, посуд, зброю, кнігі і нават «скрыпку валоскую». Зьдзейсьнілі гэтае зладзейства браты нябожчыка Яна — Станіслаў і Жыгімонт Захарэўскія з памагатымі.

Сутычкі паміж суседзямі, крэўнымі і чужымі людзьмі адбываліся часта і даволі галосна, пра што і сьведчаць актавыя кнігі. Словы «карчомныя», «злые», «шкаредные», «перхливые», «соромотные», «заражоныя» можна было пачуць ва ўсіх месцах, дзе зьбіраліся з розных патрэбаў тагачасныя жыхары.

Найчасьцей «злое серце» праяўляла сябе пасьля гарэлкі. Седзячы разам на бяседзе, два зямяніны, Абрамовіч і Зубцэвіч, усхапіліся адзін да аднаго, лаючыся і махаючы кулакамі: «зубы я тебе стресну, жи ничого не будеш меть!» Другі зямянін падаў скаргу судоваму пісару на свайго непрыяцеля, які «жылы мои з мене волочити похвалился».

У мястэчку Дамашэвічы возны Вацлаў Замаскі пасварыўся зь зямянінам Іванам Голубам, пасьля чаго «Иван Голуб не маючы до мене жадное потребы, упившися, почал мене словы неучстивыми лаять, соромотить, которыми словы дотькливыми невинне мене чоловека невинного обельжыл... на учстивое уроженье мое и пани матки моее, на руку мене по килька разов до бою вызывал, ... отповед и похвалку на убойство, на здорове мое, а на маетность мою пожогою у очы мне учынил...»

Найбольш крыўднымі былі абразы, якія тычыліся паходжаньня і закраналі гонар маці, што і адбылося ў выпадку з возным Вацлавам Замаскім. «Нечыстага ложа сын», «неучстивое матки сыном» — абразы, якія найчасьцей сустракаюцца на старонках актавых кніг.

Нягледзячы на тое, што возныя, як і іншыя службовыя асобы, мелі пэўныя правы і абароны, замацаваныя Статутам, яны таксама траплялі ў вір сварак і звадак, атрымоўваючы сваю долю лаянкі і праклёнаў. «Злодеем, фальшером, зрадцою, забойцою и згубцою» абазваў службовага выканаўцу менскі мешчанін, калі апошні паспрабаваў перадаць яму судовыя лісты. «Ты посланче, больш того передо мною не стой, иди собе ку дьяблу...» Зямянін Стэцка Петраневіч, пасварыўшыся з возным Шчасным Міхайловічам, «перд людми сторонними веры годными вчынил тыми словы: ...панство его дымом к горе пойти бы мусяло...» Возных абвінавачвалі ў ашуканстве і нават пагражалі: «ты, потварца, вже по другий раз до меня едиш с фальшивыми листы и минается тое, але гды третий раз приедешь, певне тя кий не мине!» Не пазьбегнуў пагрозаў у свой адрас і пісар менскай мытні Васіль Масьленка, якому пагражаў менскі мешчанін: «...буду се старат зо всих мер, яко бым тобе, Василю Масленка, с сего света згладил и о смерть приправил».

Шум і гвалт даносіліся ня толькі з двароў і рынкаў, але і з прадстаўнічых установаў, як, напрыклад, зь Менскага замку, дзе на той час месьцілася канцылярыя Менскага гарадзкога суду «с книгами гродскими менскими, справами всей Речи Посполитой, Великого князства Литовского належачыми...» Гэтак, сустрэўшы ў будынку суду зямяніна Міхайлу Ваўка, судзьдзя земскі войскі рэчыцкі Пётра Зяновіч «звазнившысе на него, словы неучстивыми, доброй славе его дотькливыми лаял и соромотил, яко се ему уподобало... *Ты, Михайле, вперед озмеш од мене конечно корбачом, ...и нехай бых дей цнотливым не был, если того не сполню...*»

Вялікая колькасьць скаргаў у актавых кнігах тычыцца абвінавачаньняў і абразаў у нешляхецкім паходжаньні. «...На славе учстивой шляхецкой мажучы ущыпливе и несправедливе...» Сваркі і сутычкі адбываліся найчасьцей паміж шляхціцамі, якія знаходзіліся на розных сацыяльных прыступках. Вось дзе закіпала кроў і рукі самі цягнуліся да зброі. *«Ты не шляхтич — одно холоп»* — крычалі адно адному людзі.

Некаторыя здарэньні ішлі далей за словы і судовыя разборы. У справу пускаліся кулакі й непрыхаваны гвалт. Гэтак адзін шляхціц зьбіў другога, свайго суседа, на полі, дзе той працаваў, а пасьля яшчэ й жонку ягоную згвалціў і заявіў утаптанаму ў зямлю чалавеку: «естес ты *мужык, смерд*, чого и доводит на тебе естем готово».

Шляхціц з Плаўскага Ждан Васілевіч пагражаў свайму суседу Трахіму Сямёнавічу, зь якім нечага не падзяліў: *«Где тебе поткаю, там забью, або горло твое вырву, або теж огнем дом твой спалю, иж увесь у порох пойдеш...»*

Суд уважліва разглядаў падобныя справы, адносячы іх у шэраг складаных.

Непаразуменьні здараліся і сярод магнатаў. Князь Юры Чартарыйскі, «маючы затруднене справы» праз княгіню Саламярэцкую, ня мог уразумець, навошта княгіня робіць яму гэта, «поступуючы не так яко се годит вольному з вольным и оселым, але яко з голотою и неоселым».

Не ўжываліся іншы раз паміж сабой і крэўнікі ў сям'і. «Братэрская неприязнь», «злое мешкане» — старыя як сьвет узоры няпростых чалавечых дачыненьняў. *«Дай покой, не сварися з отцом!»* — чытаем мы сьлёзныя заклікі ў старых запісах.

Пад час судовых разбораў здараліся й казусы. Падстолі Фёдар Мялешка «неучстивую примовку учинил» пану Кандрату Мялешку. Пасьля чаго ў судзе паведзіў, што «не ку обельживости вашай милости *слова тые фортельные* мели быти... але то есть *мудрость* и для простоты и неумеетности своее помовил...» Кандрат жа Мялешка, спасылаючыся на артыкул 62 з разьдзелу 4 Статуту, за тую «прымовку неучстивую» патрабаваў «сторону отпорную карать с тых причин, иж дей первей тую примовку фортельную поведил быть ровную фальшу, а теперь... мудростю ее называет».

«Тыран», «погански бесурманин», «злодей бородаты», «ведма», «душа забеглая»; «головою наложиш», «дыба на тебе» — вось шырока ўжываныя абразы і праклёны той пары. Але абразіць можна было ня толькі словам, але й жэстам, і ўчынкам. Гэтак, рыкуньню дворную Малгажату ўраднік *«в палец образил»*. «Непрыстойную справу» ўчыніў з падданымі сяла Камень Завілейскі ўраднік маёнтку Крайскі Ян Хмара, калі загадаў ім лезьці голымі на дрэвы — «...мордерство ганебное над ними чыніл, узганяючы их на сосны нагими, им се до голей везати се казал». А на двары стаяў месяц люты.

Жорстка і зьняважліва абышліся і з падданым падскарбія Андрэя Завішы Шапавалавічам зь сяла Сьмілавічы ў менскай плябані, асабліва калі ўлічыць, што ўчынілі гэта божыя служкі ў сьвятым месцы. Вось што распавядаў у судзе пра здарэньне сам пацярпелы: «шол до плебана менского до ксендза Миколая Морса... тогды дей, гды до него до светлицы прышол, там же дей он не заховуючысе прыстойне ку особе духовной належит, росказал врадніку своему и хлопятом... мене полопить и бороду острич, которые дей то слуги мене у светлицы на лаве положивши бороду, чынечы посмешки, остригли и мене самого збили и змордовали...» Пасьля чаго сьведчыў у судзе «бороду при самом теле пострижоную».

У Слоніме пацярпеў ганчар Хацута Русаковіч ад дурнога сваволства сядзельніка Піліпа Хампіча, які насыпаў таму гарачага вугольля за каршэль, «...жаратком зжог, насыпал за шию... немалый зожжег показал над плечима...»

Артыкулы Статуту, якія «постерегали того, абы се таковая злость межи людми не множила», не маглі выправіць чалавечае нутро, скіраванае на зло. Зладзействы часам рабілі й кабеты: «...и коли там перед нее панею своею того подданого Ивана Бобика прывели, тогды дей она, пани Волчковая, без боязни Божое и без встыду белым головам звыклого, казала его перед собою розобрат до нагого тела, окрутне бить и мордовать, по которым морде и тепер дей нет ведомости где его подела...»

Часам чалавек нейкім дзіўным чынам зацята рабіў шкоду самому сабе ці сваёй уласнай маёмасьці, што выклікала зьдзіўленьне і абурэньне грамады. Каторы ўжо раз мужыкі вёскі Яскельда, «на толоце будучи» ў зямяніна Яна Міневіча пасьля тушэньня пажару ў ягоным гумне, пераконвалі гаспадара, «абы больш не палил». Але ўнураны ў сваю змрочную задуму дзівак, «взявши огонь у суседу своего, гумно свое вжо за четвертым разам запалил». Прыбегшых на пажар людзей, «которое запалене гасить хотели», разьюшаны падпальнік сустрэў «ощепом» са словамі: «я своё запалил, а не чужое, до чего нехай нихто ничого не мает...»

Крыўда, нянавісьць, помста вярэдзяць душу і ўдзень, і ўночы. У гэтым жыцьці. Але чалавек усё ж уяўляў марнасьць гэтага імгненьня, згадкі пра што можна знайсьці ў шматлікіх тагачасных тэстамэнтах: «...Всякие речи на свете с памяти людское сходят и сплывают...» ■

Малюнкі Сяргея Харэўскага

***«Наша Ніва»** працягвае публікаваць тэксты гісторыка Вольгі Бабковай, створаныя на матэрыяле архіўных актавых кніг. Кожны тэкст — гэта выбраныя эпізоды з жыцьця нашых продкаў. У ранейшых нумарах пра тое, як яны ставіліся да сьмерці, да падарожжа або да ведзьмаў, уласнымі галасамі і тагачаснай мовай распавядалі самі старажытныя беларусы. Сёньня — пра тое, як яны сварыліся і абражалі адзін аднога. Можна параўнаць з намі сёньняшнімі...*

СЛОЎНІК СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЫ:

фортка — *брамка*
машкара — *маска, пудзіла, патвора*
похвалка — *пагроза, намер зрабіць замах на жыцьцё, здароўе, маёмасьць*
корбач — *пуга, бізун*
фортель — *інтрыга*
збытки — *свавольства*
толковиско — *месца на зямлі*
гаковница — *ручная стрэльба, агнястрэльная зброя, прызначаная для абароны замкаў і гарадзкіх умацаваньняў*
белая галава — *кабета*

ЛІСТ ФЁДАРАВА ПАЗЬНЯКУ

Анатоль Фёдараў

Гэты ліст быў напісаны старшынём Магілёўскай Рады Беларускага Народнага Фронту Анатолем Фёдаравым у верасьні 1999 г. у адказ на прапанову Зянона Пазьняка падзяліць Фронт на рух і партыю. У рэдакцыю ліст перадаў Алесь Асіпцоў. Гэты цікавы гістарычны дакумэнт нашай эпохі друкуецца з ласкавае згоды аўтара.

Паважаны Зянон Станіслававіч!

Нягледзячы на тое, што сп. Папкоў і зьезд* разьвялі нас у розныя бакі, лічу сваім абавязкам даслаць Вам гэты ліст.

Мяркую, тое, што здарылася, было непазьбежна, і 1.08 я, як і многія, вымушаны быў прыняць няпростае рашэньне. Тым ня менш, яшчэ за тры дні да зьезду я рабіў усё магчымае, каб пераканаць «апазыцыю» ў неабходнасьці (у магчымасьць гэтага яны ня верылі) канструктыўнае размовы з Вамі. І пераканаў. Мае прапановы былі прынятыя. Да Вас яны прыехалі зь мірам і жаданьнем аб усім дамовіцца, **як сябрам**. Але, як высьветлілася, усе рашэньні былі прынятыя, і іх заставалася толькі выслухаць. Вельмі канкрэтна па форме.

Такім чынам, зноў, як і пад час выбараў, верх атрымалі дэструктыўныя сілы й меркаваньні, якія рабілі мяне й шмат іншых Вашымі ворагамі, але запэўнівалі Вас у перамозе. У выніку Вы адрынулі працягнутую руку.

У першы дзень зьезду да глыбокае начы нашыя дэлегацыі абмяркоўвалі, што рабіць. Падтрымаць Пазьняка — значыць, пайсьці на раскол, на кастрацыю арганізацыі. Не падтрымаць — зрабіць штосьці не зусім годнае. У рэшце рэшт быў абраны трэці варыянт, каб старшыня на зьезьдзе ня быў абраны, а зьезд — адкладзены. Такі варыянт даваў час для пошуку кампрамісаў і шанец для захаваньня арганізацыі.

У гэтым была сутнасьць нашае пазыцыі.

Што тычыцца Вашае пазыцыі, то, нягледзячы на тое, што ў ёй утрымлівалася нямала з таго, што мы абмяркоўвалі раней, там адначасна гучалі прапановы, якія рабілі ўсё папярэдняе ня больш чым гучнай дэклярацыяй. Пацьверджаньнем таму сталі прапанаваныя склад Сойму й намесьнікаў, што й вырашыла зыход зьезду. Прывялі ж зьезд да такога выніку тыя «добразычліўцы», якія іх рыхтавалі. Можна павіншаваць іх!

На жаль, Зянон Станіслававіч, за маім адмоўным стаўленьнем да пэўных сяброў Фронту Вы бачыце толькі прадмет маіх асабістых адносінаў зь імі. Але гэта ня так. Для мяне сп. Папкоў — гэта не асоба, а зьява, якая стала вынікам пэўных праблемаў у Фронце і Вашых праблемаў. Гэта «распуціншчына», распад. Падтрымка й выкарыстаньне такіх асобаў ёсьць **зьнявагай для** ўсіх. Гэта дыскрэдытацыя арганізацыі й ганьба для Вас асабіста. На жаль, Вы гэтага, здаецца, не заўважылі.

Але справа ня толькі ў гэтым. Гэтая асоба, незалежна ад матываў яе паводзінаў, зьяўляецца разбуральнікам Фронту й Вашым магільшчыкам! Гаворка, што Вы ня бачыце яе дзейнасьці, — не аргумэнт. Бачны яе вынікі. Калі кіраўнік не жадае зьвяртаць на іх увагу альбо шукае надуманых прычынаў, яму прыйдзецца змагацца нават не з рэальнасьцю, а самому з сабой.

Так адбываліся апошнія выбары. Так быў справакаваны канфлікт з рэгіянальнымі арганізацыямі. Так зьявіліся «дзіўныя» прапановы на зьезьдзе. Так былі зробленыя пасьпешлівыя заявы пасьля зьезду. Заявы й дзеяньні, якія выклікалі толькі шкадаваньне й зьдзіўленьне.

Па сутнасьці сёньняшніх справаў.

Зразумела, мы атрымалі Ваш ліст да сяброў Фронту ад 08.08.99 г. і абмеркавалі яго. Стаўленьне большасьці нашых сяброў і маё асабістае да зробленых прапановаў аб падзеле Фронту нэгатыўнае. Мы ведаем, хто іх рыхтаваў. А таму зноў, як і ў траўні, пасьля выбараў, я з усёй адказнасьцю заяўляю, што гэта правакацыйныя прапановы, гэта вайна ў Фронце й разбурэньне Фронту. Я гавару гэта як чалавек, які 10 гадоў займаецца непасрэднай арганізацыйнай працай у структурах.

На першы погляд, прапановы выглядаюць абгрунтавана й прыгожа. Але гэта той выпадак, калі гавораць, што добрымі намерамі выбрукавана дарога ў пекла. Нават да гэтага часу, калі Фронт заставаўся адзінай маналітнай арганізацыяй, у многіх яго структурах узьнікалі вельмі цяжкія канфлікты, якія прыводзілі да паралізацыі гэтых структураў, да іх драбленьня й разбурэньня. Гэта адна з прычынаў крайняй слабасьці нашых арганізацыяў у шэрагу рэгіёнаў. Калі ж падзел і непазьбежны канфлікт у фронтаўскія структуры будзе ўнесены масава, пачнецца самае неверагоднае, уключаючы гвалт, нахабную хлусьню, шантаж, даносы ў адпаведныя органы, судовыя разборкі ды іншае. Нямала што з гэтага арсэналу выкарыстоўваецца ўжо сёньня. У поўнай меры я адчуў гэта на сабе. Менавіта так «адстойвае» інтарэсы Пазьняка ўсё тая ж група асобаў, падвяргаючы ганьбе й шальмаваньню яго «ворагаў». Так, ім у прыклад, дзейнічаюць ужо іншыя. Што ж будзе далей?

Але ёсьць іншы шлях. Шлях паразуменьня і ўзаемнай павагі. Павагі да тых, Зянон Станіслававіч, з кім Вы пачыналі, з тымі, каго Вы сёньня называеце «канфармістамі», а сп. Папкоў, больш шчыра — «калябарантамі». Магу Вас заверыць, «калябарантамі» хутка будзе асноўная большасьць сяброў Фронту, сёньня ўжо большасьць. У «патрыётах» жа са сп. Папковым застанецца купка маргіналаў, крыклівай і ні да чаго няздатнай публікі, ізаляванай грамадзтвам. Я за гэтымі «патрыётамі» не пайду і іншым не параю.

Адносна кааліцыі.

На мой погляд, стварэньне такое кааліцыі выглядае штучна. Да таго ж, яна будзе разьдзірацца нутранымі супярэчнасьцямі й сваркамі. Немагчыма таксама, каб адна частка кааліцыі ўтрымлівалася за кошт другой. Ня думаю, што сп.сп. Вячорка, Бяляцкі, Івашкевіч, Сіўчык, Баршчэўскі, Хадыка й шмат хто іншы задавольцца працай у грамадзкім сэктары, куды іх гуртам «сьпісалі». Ня пойдуць яны і ў іншыя партыі, «пад Ганчара» або каго яшчэ. Нежаданьне лічыцца з гэтым ёсьць нежаданьнем лічыцца зь імі як асобамі, і нічога добрага ня дасьць.

Што тычыцца маёй пазыцыі, то яна застаецца ранейшай і сутнасьць яе ў наступным:

1. Фронт застаецца адзінай згуртаванай арганізацыяй, якая паступова зноў ператвараецца ў шырокі грамадзкі й палітычны рух.

2. Зьмяняюцца прынцыпы кіраўніцтва й дзейнасьці арганізацыі, з улікам часу й абставінаў.

3. Кіраўніком Фронту застаецца сп. Пазьняк як бясспрэчны лідэр Беларускага вызвольнага руху.

4. Улічваючы эміграцыю кіраўніка Фронту, на яго ўскладаюцца тыя абавязкі, якія ён здольны рэальна й эфэктыўна выконваць.

5. Непасрэднае кіраўніцтва Фронтам ажыцьцяўляецца ў Беларусі.

6. Кіраўніку Фронту ў Беларусі, з мэтай пасьпяховага вырашэньня палітычных і іншых задачаў, прадастаўляецца права фармаваньня сваёй каманды.

7. Кіраўніцтва Фронтам ажыцьцяўляецца на калегіяльнай аснове.

8. Прадугледжваюцца мэханізмы рэальнага ўплыву кіраўніка Фронту, які знаходзіцца за мяжой, на прыняцьце рашэньняў.

Зразумела, вярнуцца да гэтае мадэлі пасьля зьезду цяжэй, чым да яго, але мажліва. І вырашальнае слова тут могуць сказаць рэгіянальныя арганізацыі, Малады Фронт. Канструктыўную пазыцыю займаюць і многія сябры «апазыцыі», у тым ліку сп. Вячорка. Не сумняваюся, што такія рашэньні, калі будзе ініцыятыва з боку Пазьняка, будуць прынятыя. Відавочна, што прапанаваная мадэль недасканалая й патрабуе дапрацоўкі і ўзгадненьняў. Але час да зьезду ёсьць. Патрэбная толькі добрая воля, павага й давер.

Калі ўсё ж кіраўнік Фронту абірае падзел, то, з улікам абставінаў, ён павінен быць вельмі асьцярожны й прадуманы. Безь зьнявагі й «дурняў». Мяркую таксама, што для ўсіх сяброў Фронту, пры ўмове падзелу, павінна застацца магчымасьць, няхай фармальная, сяброўства ў любой з гэтых арганізацыяў, а асноўныя рашэньні, якія тычацца іх сумеснай дзейнасьці й прадстаўніцтва, прымаюцца на парытэтнай аснове.

Хачу асабліва падкрэсьліць, што ніякі працэс дыялёгу й канструктыўных зьменаў у Фронце немагчымы пры ўдзеле сп. Папкова. Разбуральная дзейнасьць гэтай асобы й яе прыхільнікаў павінна быць рашуча прыпыненая, калі мы хочам захаваць арганізацыю.

Адносна суб'ектаў дыялёгу

Чамусьці лічыцца, што такіх суб'ектаў толькі два. Умоўна кажучы, Пазьняк і Хадыка, альбо Пазьняк і Вячорка. Вельмі амбіцыйнае меркаваньне. Мяркую, што такіх суб'ектаў сёньня больш. Па-першае, гэта рэгіянальныя арганізацыі, роля якіх у Фронце значна ўзрасла. Узрос досьвед і аўтарытэт іх лідэраў. Фактам стала каардынацыя іх дзейнасьці. Невыпадкова, што пад час выбарчае кампаніі адпаведная праца была лепш арганізаваная ў шэрагу рэгіёнаў, чым у «цэнтры». Але камусьці падаюцца недарэчнымі ўзрослыя ініцыятыва й прэтэнзіі гэтых арганізацыяў. Высьветлілася, што рост іх уплыву — рэч наагул непажаданая. Пачаўся брутальны ціск на структуры. Але кавалерыйскія «наезды» вынікаў не далі й не маглі даць. І на зьезьдзе рэгіянальныя арганізацыі сказалі сваё вырашальнае слова. Скажуць яго і ў далейшым.

Па-другое, Малады Фронт. Прапановы вывесьці моладзь за межы палітычнае дзейнасьці й нашых спрэчак нерэальныя й шкодныя. Матывы такіх прапановаў відавочныя. Але незалежна ад гэтых матываў, моладзь ужо сказала сваё слова ў палітыцы, і голас яе мацнее. Мяркую, менавіта яна здабудзе ў XXI стагодзьдзі нашу славу й незалежнасьць. Таму слова моладзі — важкае слова, да якога трэба прыслухацца.

Паважаны Зянон Станіслававіч! Сёньня мы на раздарожжы. Ад Вас залежыць, які шлях абраць. Гэта цяжкі й адказны выбар, дзе нельга памыліцца. Давайце ж зробім яго разам.

Жадаю Вам посьпехаў і бласлаўленьня!

Анатоль Фёдараў,
старшыня Магілёўскай Рады БНФ

**Маюцца на ўвазе намесьнік З.Пазьняка Сяргей Папкоў і шосты зьезд БНФ.*

ЖЫЦЬЦЁ І ПРЫГОДЫ СЯРЭДНЯГА ВЕКУ НАЦЫЯНАЛІСТА

Пра што думае 40-гадовы чалавек, які перажыў у юнацтве рамантычны нацыянальны ўздым, а сёньня жыве ў рэальнай, а не ў віртуальнай Беларусі? З чаго пачынаўся гэты юнацкі ўздым, зь якіх акалічнасьцяў, прычынаў, абставінаў? Як быць верным ці няверным юнацкім марам? Якімі жыцьцёвымі сытуацыямі аздоблены шлях беларускага нацыяналіста канца XX стагодзьдзя? У беларускім кіно такія пытаньні нават яшчэ не фармуляваліся, але яны існуюць і хвалююць. Пытаньні нацыянальнага самавызначэньня і непазьбежнай потым раздвоенасьці жыцьця.

Гэта тэма фільму, не дакумэнтальнага, але ігравога, пастановачнага, жанравага, не выключаючы і жанру эксцэнтрычнае камэдыі.

Рэдакцыя газэты «Рабочы» абвяшчае конкурс кінасцэнароў на гэтую тэму. Аб'ём паўнамэтражнага літаратурнага сцэнару ад 50 да 70 друкаваных старонак.

Тэрмін падачы твораў на конкурс да 30 сьнежня 1999 г.

Вынікі конкурсу будуць падведзеныя ў друку ў канцы лістапада.

Прызавы фонд 1000 у.а.

Сцэнары дасылайце на адрас: 220030, Менск, пл. Свабоды, 23, газ. «Рабочы».

Тэл. для даведак: **227-31-45** з 9.00 да 11.00, **236-61-42** з 15.00 да 17.00.

Эдгар Алан По

Авальны партрэт*

Замак, у які мой слуга наважыўся праламіцца гвалтам, каб не дазволіць мне ў маім безнадзейна немачным стане прабавіць ноч пад голым небам, уяўляў сабою адну з тых напышлівых і панурых каменных крушняў, што здавён змрочна высіліся сярод апэнінскіх схілаў, нібы спароджаныя фантазіямі спні Рэдкліф. Па ўсім было відаць, што ягоныя насельнікі часова і зусім нядаўна яго пакінулі. Мы разьмясьціліся ў адным з найменшых і найсьціплей абстаўленых пакояў, які ляжаў у невялічкай вежы наўскрай будынку. Ён быў багата аздоблены габэленамі і завешаны шматлікімі і разнастайнымі геральдычнымі шчытамі, разам зь незвычайна высокай колькасьцю вельмі жывых сучасных карцінаў у рамах з залачонымі арабэскамі. Гэтыя карціны, якія віселі ня толькі на самых сьценах, але ў шматлікіх угінах і сховах, якія непазьбежна ўтвараліся дзівоснаю архітэктураю замка, неяк дзіўна мяне зацікавілі, мабыць таму, што я ўжо пачынаў трызьніць; і я папрасіў Пэдро зачыніць цяжкія аканіцы — бо за вокнамі ўжо стаяла ноч, — запаліць сьвечкі ў высокім кандэлябры, што стаяў у галовах майго ложку, і адхінуць заслоны з чорнага аксаміту, якія закрывалі сам ложак. Усё гэта я загадаў зрабіць дзеля таго, каб аддацца калі ня сну, дык прынамсі папераменнаму сузіраньню гэтых карцінаў і гартаньню невялікай кнігі, якую я знайшоў каля падушкі і якая зьмяшчала іхны агляд і апісаньне.

Я доўга-доўга чытаў і пільна-пільна ўглядаўся. Гадзіны праляталі хутка і ўрачыста, пакуль не настала глыбокая поўнач. Мне не спадабалася, як стаіць кандэлябар, і, зь цяжкасьцю працягнуўшы руку, каб толькі не будзіць прыснулага слугу, я пераставіў яго так, каб полымя паўней асьвятляла кнігу.

Аднак гэтае дзеяньне мела зусім неспадзяваны вынік. Промні ад сьвечак (а іх было некалькі) цяпер асьвятлялі нішу, якая дагэтуль патанала ў глыбокай цемры каля адной з апораў ложку. І я пабачыў у зыркім сьвятле незаўважную дагэтуль карціну. Гэта быў партрэт дзяўчыны, у якой толькі пачала высыпяваць жаноцкасьць. Я пасьпешліва зірнуў на карціну і заплюшчыў вочы. Чаму я гэтак зрабіў — мне й самому адразу было незразумела. Але пакуль павекі заставаліся апушчаныя, я ў думках пашукаў прычыну — чаму я заплюшчыў вочы. Гэта быў міжвольны рух, каб заашчадзіць хвілінку на роздум — каб упэўніцца, што мой зрок мяне не падмануў — каб супакоіцца і падпарадкаваць уяўленьне цьвярозаму і пэўнаму роздуму. Празь некалькі імгненьняў я зноў пільна ўзіраўся ў карціну.

Што мне не прымроілася — у тым не было аніякага сумневу; бо першы водбліск полымя на палатне, як здалося, разьвеяў мройнае здранцьвеньне, якое апанавала мае пачуцьці, і ўмомант абудзіў мяне да жыцьця.

Гэта быў, як я ўжо казаў, партрэт дзяўчыны. Звычайны партрэт, калі ўжыць тэхнічны тэрмін, у манеры віньеткі; вельмі падобны стылем да партрэтаў Сюлі. Рукі, грудзі і нават кончыкі прамяністых валасоў незаўважна зьліваліся зь няясным і глыбокім ценем, які ўтвараў тло карціны. Рама была авальная, пакрытая багатым залачэньнем і маўрытанскімі філігранямі. Як твор мастацтва сама карціна была дасканалая. Аднак наўрад ці самое выкананьне ці несьмяротная прыгажосьць твару маглі так раптоўна і моцна мяне ўразіць. І ўжо зусім не магло быць, каб маё ўяўленьне, абуджанае ад паўсну, магло зблытаць партрэт з жывым абліччам. Я адразу пабачыў, што асаблівасьці ўзору, стылю і рамы мусілі б адразу разьвеяць гэткую думку — мусілі б ня даць ёй узьнікнуць нават на імгненьне. Паважна думаючы над гэтымі пытаньнямі, я нейкую гадзіну сядзеў у ложку, ня зводзячы вачэй з партрэта. Нарэшце, задаволены сапраўднай таямніцай ягонага ўзьдзеяньня, я зноў лёг. Чары карціны, на маю думку, палягалі ў абсалютнай жыцьцепадобнасьці выразу твару, які спачатку зьдзівіў, а пасьля зьбянтэжыў, скарыў і спалохаў мяне. З глыбокім і багавейным страхам я паставіў кандэлябар на старое месца. Калі прычына майго глыбокага хваляваньня схавалася ад вачэй, я пачаў прагна гартаць кнігу, дзе апісваліся карціны ды іхныя гісторыі. Знайшоўшы нумар, якім быў пазначаны авальны партрэт, я прачытаў так гэткія няясныя й дзівосныя словы:

«Яна была панна незраўнанае прыгажосьці, і весялосьць яе не саступала ейнай красе. І ў ліхую гадзіну пабачыла яна, пакахала і ўзяла шлюбам мастака. Ён быў апантаны, заўзяты, няшчадны і ўжо меў за нявесту сваё Мастацтва; яна ж была панна незраўнанае прыгажосьці, і весялосьць яе не саступала ейнай красе; яна зьзяла і ўсьміхалася і скакала, як маладая лань; любіла й песьціла ўсё, што бачыла навокал; ненавідзела толькі мастацтва — сваю злую суперніцу; баялася толькі палеты і пэндзляў ды іншых нясьцерпных снадзіваў, якія забіралі ў яе каханага. Таму страшна было пачуць гэтай паньне, што мастак жадае намаляваць партрэт сваёй нявесты. Аднак яна была пакорлівая й паслухмяная і аддана сядзела доўгімі тыднямі ў цьмяным пакоі ў вежы, дзе на бледнае палатно аднекуль высока згары падала рэдкае сьвятло. Аднак ён, мастак, упіваўся славаю ад свае працы, якая цягнулася гадзінамі, дзень пры дні. Гэта быў апантаны, дзікі й наравісты чалавек, які згубіўся ў сваіх мроях; так што ён і не заўважыў, як прывіднае сьвятло ў самотнай вежы пачало губіць здароўе і сілу ягонай нявесты, чыё павольнае зьвяданьне заўважалі ўсе, апрача яго. Але яна й надалей усьміхалася і не наракала, бо бачыла, што мастак (які меў немалую славу) адчуваў ад сваёй працы пякучую асалоду, ён працаваў дзень і ноч, каб намаляваць тую, што так яго кахала і што няможала й слабла з кожным днём. І сапраўды, усе, хто глядзеў на партрэт, шэптам гаварылі пра падабенства як пра вялікі цуд, як пра доказ ня толькі вялікага майстэрства мастака, але й яго бязьмежнага каханьня да той, каго ён так незраўнана апісаў на карціне. Аднак урэшце, калі праца ўжо набліжалася да завяршэньня, у вежу перасталі пускаць старонніх людзей; мастак зусім зьдзічэў у запале сваёй працы і рэдка зводзіў вочы ад палатна, нават каб паглядзець на жончын твар. Таму ён і не заўважаў, што адценьні, якія ён наносіў на палатно, браліся з шчокаў той, што сядзела побач зь ім. І калі мінула яшчэ некалькі тыдняў і засталося зрабіць зусім мала, правесьці пэндзлем па вуснах і дадаць адценьня вачам, душа панны ўскалыхнулася, як полымя лямпы перад згасаньнем. І тады фарба легла на вусны і адценьне дадалося вачам; і мастак на хвіліну застыў, зачараваны сваім творам; аднак празь імгненьне, яшчэ не адвёўшы вачэй ад партрэта, ён задрыжаў і сьмяротна зьбялеў, і ў жаху закрычаўшы немым голасам: «Дык гэта ж самое жыцьцё!», павярнуўся да сваёй каханай: — *Яна была нежывая!*»

Пераклаў з ангельскай Сяргей Шупа

**Іншы пераклад гэтага апавяданьня быў надрукаваны ў 1953 годзе ў мюнхенскім часопісе беларускай моладзі «Наперад» і перадрукаваны адтуль у «НН» 10 лютага 1997 г. у N5-6 (79). Аўтар таго перакладу невядомы.*

«Беларускі сьлед» Эдгара По

150 гадоў таму 7 кастрычніка памёр амэрыканскі пісьменьнік Эдгар По

Юбілейная дата ня стала апошняй кропкай у біяграфіі чалавека, які сьведама пераблытаў уласнае жыцьцё зь літаратурай і таму, як гэта ні банальна, працягвае жыць разам з сваімі творамі.

Прысутнасьць По ў беларускім кантэксьце асаблівая. Скажам, варта было «Нашай Ніве» ў пачатку 90-х заявіць пра намер перакласьці і выдаць усю спадчыну пісьменьніка, як на працягу некалькіх гадоў зьявіліся пераклады ягоных клясычных твораў, прычым па некалькі перакладаў адных і тых апавяданьняў і вершаў, зробленых рознымі аўтарамі. Дастаткова назваць паэмы «Крумкач» і «Ўлялюм» або навэлу «Авальны партрэт». Такой прыцягальнасьцю вызначаліся хіба што творы Аляксандра Пушкіна, пераклады якіх рабіліся на замову да юбілеяў. Розьніца ў тым, што перакладаў По ніхто не замаўляў.

Дарэчы, наконт Пушкіна. Хуліо Картасар у сваёй прадмове да кнігі По некалькі разоў згадвае пра Пушкіна, аднойчы нават называе яго «расейскім По». Але такое параўнаньне наўрад ці прыдатнае для нашых стэрэатыпаў і ўяўленьняў. Пушкіна зрабілі дзяржаўным паэтам, а По так і застаўся жывой загадкай — алькаголікам і наркаманам, які пісаў геніяльныя вершы і апавяданьні ды неадэкватна паводзіў сябе ў розных жыцьцёвых сытуацыях. Кароткае жыцьцё і кароткая творчасьць. Раптоўныя выбухі шчасьця і працяглыя тыдні дэпрэсіі. Пакутніцкая сьмерць.

Картасар апісвае той дзень, 7 кастрычніка 1849 году, наступным чынам:

«У пэрыяды дэпрэсіі, зьвязанай часткова з хваробай сэрца, По зьвяртаўся да алькаголю, як да выратавальнага стымулятара. Але нават малая колькасьць сьпіртнога згубна ўзьдзейнічала на ягоны мозаг. Гэткім заганным шляхам падзеі, хутчэй за ўсё, і пайшлі на борце карабля ў часе плаваньня ў Балтымор. У Рычмандзе лекары папярэдзілі Эдгара: яшчэ адзін зрыў будзе згубным для яго. І яны не памыліліся. 29 верасьня карабель стаў на прычал у Балтыморы. По зьбіраўся цягніком даехаць да Філядэльфіі, але цягніка трэба было чакаць некалькі гадзінаў. Гэтыя гадзіны і вырашылі ягоны лёс. Вядома, што калі ён зьявіўся да свайго сябра, ён ужо быў п'яны. Далейшае — здагадкі. Перад намі пяцідзённы прабел: празь пяць дзён нейкі лекар, знаёмы з По, атрымаў сьпешна напісаную алоўкам цыдулку, дзе паведамлялася што пэўны джэнтльмэн, «вельмі дрэнна апрануты», тэрмінова патрабуе ягонай дапамогі. Цыдулку напісаў нейкі друкар, які пазнаў По ў абсалютна п'яным чалавеку, які сядзеў у тракціры ў атачэньні публікі самага нізкага капылу. У горадзе адбываліся выбары, і партыі-суперніцы спайвалі ўсялякі зброд ды вадзілі яго на выбарчыя ўчасткі. Магчыма, і По быў выкарыстаны ў якасьці наёмнага выбаршчыка, а пасьля пакінуты ў тракціры, дзе яго і пабачыў друкар. Яшчэ пяць дзён у балтыморскай лякарні По згараў у жахлівых галюцынацыях, у змаганьні зь сядзелкамі, якія спрабавалі яго стрымаць. У нейкі міг прасьвятленьня ён быццам бы спытаўся, ці ёсьць у яго надзея. Яму адказалі, што справы ягоныя кепскія. Ён запярэчыў: «Я не пра тое. Ці ёсьць надзея ў такой нікчэмнасьці, як я?»

Было яму 40 гадоў. Крыху вышэй Картасар называе пісьменьніка самым мужным зь бязвольных людзей.

Нарэшце, колькі словаў пра «беларускі сьлед» у біяграфіі Эдгара По.

Гутарка ідзе пра першую палову мінулага стагодзьдзя, дакладней, пра 1831 год, калі ў Беларусі адбывалася антырасейскае паўстаньне. Вось што піша Картасар:

«У сакавіку галодны і няшчасны По ледзь не завэрбаваўся салдатам у войска Польшчы, якая паўстала супраць Расеі. Ягонае хадайніцтва адхілілі».

Трэба разумець умоўнасьць уяўленьняў аргентынца Картасара пра паўстаньне 1831 году, пра тагачасны палітычны расклад у нашай частцы сьвету і пра Беларусь, якая апынулася ў самым цэнтры згаданага паўстаньня. Але ёсьць у гэтай згадцы і яшчэ адна ўмоўнасьць.

Нядоўгая біяграфія амэрыканскага пісьменьніка поўная адначасова фантастычных прыдумак, узьнікненьню якіх спрыяў сам По, і белых плямаў, якія застаюцца неразгаданымі. Часам правалы доўжацца гадамі. У гутарках зь сябрамі ён распавядаў пра свае далёкія падарожжы, а пасьля ягонае сьмерці ўжо сябры пераказвалі біёграфам тыя небыліцы. Прычым розныя сябры казалі пра рознае. Калі да гэтага дадаць яшчэ й дапушчэньні біёграфаў, дык карціна складаецца абсалютна заблытаная і неверагодная. Менавіта гэтую акалічнасьць я меў на ўвазе, калі казаў пра ўмоўнае ўяўленьне Картасара, які сьцьвярджае, што По хацеў узяць удзел у нашым паўстаньні, але яго не прынялі.

Ці сапраўды не прынялі? А галоўнае, чым было матываванае тое хаценьне По? Што ён ведаў і якой уяўляў нашую зямлю?

Адказы трэба шукаць у эпісталярнай спадчыне пісьменьніка.

Крыт.

ПА-ЗА

Сяргей ШУПА

Мы ўжо звыкліся з тым, што слова «літаратура» часта ўжываецца з рознымі этнічнымі эпітэтамі: французская літаратура, беларуская, кітайская і г.д. Гэтыя эпітэты, аднак, нельга ўспрымаць як азначэньне нейкай прыроднай сутнасьці гэтых літаратураў. З пэўнай доляй аб'ектыўнасьці можна гаварыць пра моўныя або палітыка-адміністрацыйныя характарыстыкі, і тады прымальна гучаць тэрміны кшталту ірляндзкамоўная літаратура або літаратура Магілёўскай вобласьці. Дый гэткі падыход ня будзе абсалютна дакладны — той самы пісьменьнік можа пісаць рознымі мовамі і жыць у розных краінах, не належачы адназначна да пэўнай культуры або належачы адначасна некалькім.

Таму наважуся цьвердзіць, што будзе абсурдным казаць пра «французскую» літаратуру, «беларускую» літаратуру і г.д. Літаратура можа быць толькі добрая або дрэнная. Добрая ня мае межаў і пашпартоў, яна належыць усяму чалавецтву. Дрэнная таксама патрэбная — хоць бы як дапаможны матэрыял у вывучэньні.

У СЬМЕРЦІ ЖЫЦЬЦЁ

Сяргей ХАРЭЎСКІ

Ілюстраваць творы Эдгара По даволі лёгка. Яшчэ ў мастацкай школе мы дзеля забавы малявалі вусьцішныя карцінкі паводле ягоных апавяданьняў. Зазвычай гэта былі сцэнкі гішпанскае інквізыцыі альбо карыкатурныя выявы звар'яцелага арангутанга.

Калі пазьней давялося зноў зьвяртацца да твораў По, я зразумеў, чаму гэтак проста даюцца ягоныя вобразы, чаму іх лёгка можна выяўляць на паперы. Эдгар По друкаваў свае апавяданьні ў газэтах, а таму дасягаў максымальнае завершанасьці, не пакідаючы розначытаньняў. У ягоных творах няма фантастыкі, якая цяжка паддаецца візуальнаму асэнсаваньню. Усё, што ён напісаў, магло адбыцца наяве. Бо любая крымінальная кроніка ў газэце, пагатоў амэрыканская мінулага стагодзьдзя — давала плойму завершаных і жудасных сюжэтаў. Як у апавяданьні «Чорны кот»:

«Абамлеўшы, я адхінуўся да супрацьлеглае сьценкі. Нейкае імгненьне паліцыянты заставаліся нерухомыя, апанаваныя жахам і пакорлівым страхам. У наступны міг тузін моцных рук завіхаўся каля сьцяны. Яна адразу абрынулася. Труп, ужо падгнілы і ўкрэцаны крывёю, стаяў проста перад вачыма сьведкаў».

Згадзіцеся, гэта ўяўляецца адразу, нібы на экране тэлевізару. Але, акрамя простае канстатацыі, аўтар уводзіць яшчэ й перажываньні саміх злачынцаў, распавядаючы ад іхнага імя. Вось дзе зьяўляецца тая паўмістычная атмасфэра, якая і нясе ў сабе мізантрапічную абаяльнасьць ягонае літаратуры. Узяўшыся за алавік, мастак-ілюстратар малюе не дэтэктыўную сцэну, а нешта большае, што ляжыць па-за рэчаіснасьцю.

У адрозьненьне ад сваіх сучасьнікаў, напрыклад Вашынгтона Ірвінга, Эдгар По пераўвасабляў рэчаіснасць у сюррэалізм, апярэдзіўшы гэты стыль на паўстагодзьдзя. А Ірвінг, якога побач з По ўважаюць за пачынальніка амэрыканскае літаратуры, наадварот, сюррэалістычныя паданьні Новае Англіі пераўвасабляў у штодзённасьць, пазбаўляючы іх таямніцаў. Такая «рацыяналізацыя» была даспадобы новым эмігрантам. Мо таму Ірвінга і лічаць заснавальнікам уласна амэрыканскае прозы. А чытаючы Эдгара По, мала хто задумляецца, адкуль ён родам. А тут яшчэ й характарыстыкі канкрэтнага гістарычнага часу прападаюць у ягоных творах. Як у вершы «Анабэль Лі»:

І таму я ўначы тут ляжу на плячы
Самай юнай каханай і пекнай з жанчын
Ў каралеўстве прыморскай зямлі —
Тут, у склепе прыморскай зямлі...

Я ўяўляю сабе шырачэзны дыяпазон візуальнага адлюстраваньня гэтых радкоў: ад кляcычнае графікі з прысмакам рэтра, да найноўшага кліпу на MTV. І зноў-такі — ніякіх розначытаньняў. Склеп, нябожчыца, ейны каханак.

Нашмат цяжэй намаляваць партрэт самога Эдгара По. Колькі я ні браўся за гэтую задачу, заставалася пачуцьцё, што малюю нежывога чалавека. Сярод прыжыцьцёвых партрэтаў пісьменьніка няма ніводнага, дзе ён бы паўставаў гэткім, якім быў: алькаголік з заечай губою, з паталягічна ўвагнутым тварам. Усе ягоныя партрэты прыхарошаныя. І ў іх не разгледзець самога чалавека. Бадай, правобраз рэальнага По можна знайсьці толькі ў ягоных творах.

У пісьменьніка ёсьць навэла «Авальны партрэт» — пра мастака, які маляваў партрэт дзяўчыны. Але чым лепей атрымліваўся партрэт, чым больш у ім было жыцьцёвасьці, тым горш станавілася дзяўчыне. Мадэль урэшце памірае, калі перад мастаком на палатне паўстае ягоны шэдэўр. Гэтая навэла спарадзіла цэлую галерэю літаратурных твораў, прысьвечаных тэме партрэта і чалавека. Дарэчы, у першым сваім варыянце, 1842 году, твор зваўся «У сьмерці жыцьцё». Бясконцыя варыянты сьмяртэльных сюжэтаў По забясьпечылі яму доўгае жыцьцё. ■







ПРАСТОРАЙ І ЧАСАМ

Эдгар Алан По — прыклад аўтара, які выходзіць за рамкі любых клясыфікацыяў — і часавых, і прасторавых. Ягоная ўнівэрсальнасьць, ягоная «ўсіхнасьць» адчуваецца ўсімі «нацыянальнымі» культурамі. Азнакаю сьпеласьці нацыянальнай культуры часам называюць наяўнасьць перакладаў на мову народу пэўнага сьпісу літаратурных вышыняў — ад Бібліі да твораў Джойса. Паэзія й проза Эдгара По займае ў гэтым сьпісе адно з самых пачэсных месцаў.

Здабыцьцё Эдгара По для сваёй культуры — непазьбежная задача, якая стаяла перад маладымі палітычнымі нацыямі нашага кутку Эўропы. Найбольш карысьці з гэтага мелі эстонцы. Томік навэлаў Эдгара По, які пераклаў на пачатку стагодзьдзя мовавед Ёганэс Аавік, стаўся сапраўдным палігонам граматычных і стылістычных стандартаў эстонскай літаратурнай мовы.

Беларуская культура Эдгара По яшчэ не засвоіла. Спарадычныя публікацыі паасобных празаічных і паэтычных тэкстаў пачалі зьяўляцца ў нашай пэрыёдыцы толькі апошнім дзесяцігодзьдзем. Мінкінскі пераклад славутага «Крумкача» — улюбёнага ўзору для практыкаваньня ў рытмафанэтыцы роднай мовы — ужо трапіў у школьныя хрэстаматыі. Аднак асобнаю кнігай творы По яшчэ ў нас не выходзілі, што яшчэ раз сьведчыць пра недаробленасьць нацыі. Сьцьверджаньне Эдгара Алана По як беларускага пісьменьніка адкладаецца на наступнае тысячагодзьдзе. ■

Малюнак Сяргея Харэўскага

У ПОшуках ЭльдарадА

Верш «Эльдарада» быў напісаны й апублікаваны ў 1849 г., то бок у апошні год жыцьця аўтара, Эдгара Алана По. Вось жа, сёньняшняя публікацыя твору мае падвойна сымбалічны сэнс: тэкст друкуецца ў сто пяцідзясятыя ўгодкі як сьмерці паэта, так і свайго зьяўленьня ў сьвет.

А роўна пяцьдзясят гадоў таму, у 1949 г., і таксама не бяз сувязі з угодкамі сьмерці паэта, у 14-м нумары мюнхенскай газэты «Бацькаўшчына» быў надрукаваны напаўананімны беларускі пераклад вершу зь не зусім звыклаю, як на маё вуха, назваю «Эльдарэда». (Каб слова паходзіла з ангельскае мовы, дык перакладчыка нават можна было б пахваліць за імкненьне да дакладнасьці.) Аўтар беларускай вэрсіі тэксту палічыў патрэбным схавацца за подпісам «Ач.», і мы можам адно меркаваць пра ягоную асобу. Найхутчэй «Ач.» — гэта першая й апошняя літары прозьвішча. Антон Адамовіч? Цалкам магчыма. У кожным разе ўшануйма й пяцідзясятыя ўгодкі гэтага перакладу.

Слова «Эльдарада» актыўна ўвайшло ў мову амэрыканцаў акурат у 1849 годзе, у сувязі з «залатой ліхаманкаю». Першапачаткова яно азначала нейкае легендарнае, нечувана багатае золатам каралеўства ў Паўднёвай Амэрыцы, што было названае ў гонар свайго валадара Эль Дарада. Пасьля слова набыло абагульнены сэнс — «казачна багаты край».

Верш напісаны з вонкавай нагоды «залатое ліхаманкі». Э.По, які кідаў дакоры ўсім, што падхапілі гэтую «пошасьць», сьцьвярджае сваім творам прынцыпова іншую сыстэму вартасьцяў. Эльдарада тут — гэта не багацьце ды шчасьце ў яго суцэльна зямным разуменьні, а хутчэй высокая недасяжная мара, народжаная бунтоўным чалавечым духам. Спробы крытыкаў канкрэтызаваць мэту пошукаў героя ня мелі посьпеху: загадкавы вершнік шукае адно яму ведамае Эльдарада.

А.Х.

Эльдарэда

У зыркі строй
Прыбраўся вой
І сонца й сьценю зьведаў —
Скрозь езьдзіў ён
Пад песьні звон,
Шукаў скрозь Эльдарэда.

Так жыў век свой
Той мужны вой,
Аж сэрца сьцень наведаў...
Бо і шматка
Не напаткаў
Зямлі, як Эльдарэда.

Калі ж зусім
Пазбыўся сіл,
Спаткаў ён сьцень прадзедаў.
«О сьцень, — дрывіць, —
Дзе б мог ён быць,
Той край, край Эльдарэда?»

«За месяцовых
Гор кальцо,
Далінай сьценяў бледых
Едзь, сьмела едзь, —
Сьцень падаець, —
Як прагнеш Эльдарэда!»

Пераклаў з ангельскай
Ач.

Эльдарада

Мужны ваяр
Цераз гушчар
Зьліваў, даджоў і граду
Ў зыркай брані
Мчаў на кані
Ў пошуках Эльдарада.

Ехаў штодзень,
Ехаў, аж цень
Лёг на душу, як здрада, —
Бо не знайшоў
Ў сьвеце краёў
Пекных, як Эльдарада.

Чуючы схіл
Колішніх сіл,
Рыцар і здані рады:
«Здань, адкажы,
Дзе рубяжы
Шчаснага Эльдарада?»

«Ценяў далінаю,
Як на зямлі
Іншай ня стане рады,
Мчы, вою, мчы,.
Каб дасягчы
Любага Эльдарада!»

Пераклаў з ангельскай Андрэй Хадановіч

25 ГАДОЎ ТАМУ

1974. «Махровы застой»... Чарговая «пяцігодка» пры «разьвітым сацыялізме»... Два крокі да камунізму... З гледзішча сучаснага юнака гэтыя фразы — ня больш, чым анахранічная тарабаршчына...

У «палітычных» мардоўскіх лягерох яшчэ з сталінскіх часоў даседжваюць свае тэрміны «ворагі народу». Тыя, хто выйшаў — пад пільным наглядам «органаў»... Рагулёўскі парашутыст Цімох Вострыкаў, арыштаваны ў 1952-м, так характарызаваў 1974-ы: «У лягерох і турмах працавалі тыя самыя людзі, што і пры Сталіне... Там, за калючкамі, магло быць толькі паслабленьне *рэжыму*»...

Пратэстанцкі казанік Эрнст Сабіла, які вызваліўся з ГУЛАГу ў 69-м, у 74-м ужо вядзе набажэнствы па-беларуску. КГБ перасьледуе ягоную грамаду. «Вызваліўшыся, я толькі памяняў зоны — з «вузкай» на больш шырокую»...

Падобная сытуацыя ў Горадні, дзе нядаўні гулагавец Андрэй Данілаў утварае беларускую грэка-каталіцкую суполку...

«За рэлігію» ўжо амаль не саджаюць, але ствараюць рэальныя перашкоды ў жыцьці. Людзі працягваюць хрысьціць дзяцей, але ўпотайкі. Ці дазнаюцца ўлады — залежыць ад «бацюшкі»...

У 1974-м у Менску пачаўся так званы «акадэмічны разгром». Камісія маскоўскага ЦК выкрывала «нацыяналістаў», што «заселі» ў Акадэміі Навук Беларусі. Пасьля публічнага ганьбаваньня ды звальненьня некаторых з кампартыі і працы, цяганьня на «гутаркі» ў КГБ сытуацыя паціху нармалізуецца. Праз год-другі амаль усе працягнуць сваю навуковую працу.

Як контракрок, зьяўляецца самвыдавецкая брашура Зянона Пазьняка пад псэўданімам Генрых Ракутовіч. Гэты аналітычны агляд мае назву «Положение в Белоруси. 1974». «Политика лжи и насилия проводится репрессивными белорусскими властями в отношении интеллигенции Белоруси... Мы стоим ещё по горло в крови тридцатых годов»...

Тымчасам набягае новая хваля «нацыяналістаў». У Наваполацку КГБ «накрывае» самвыдавецкі часопіс студэнтаў палітэху «Блакітны ліхтар». Перад тым выйшла пятнаццаць нумароў. ГэБэ папужала «галоўных» В.Мудрова, В.Шлыкава, А.Рыбакова, Ул.Арлова... Але ў тым жа годзе ў менскім БДУ студэнты-гісторыкі заняліся падобнай справай: наладзілі выхад самвыдавецкага часопісу «Мілавіца». Студэнты Ўл.Арлоў, Э.Зайкоўскі, Г.Кулажанка і іншыя за два наступныя гады выдадуць сем нумароў...

Сярэдзіна 70-х — час рэабілітацыі савецкіх «органаў». На кіна- і тэлеэкранах зьяўляюцца «штырліцы» ўсіх гатункаў.

Пра НКВД ня згадваюць. У СССР даўно ўжо няма «ворагаў народу», засталіся адзінкі-«адшчапенцы» ці «псыхічна хворыя»...

Адносна паваенных гадоў, жыць у БССР стала нашмат лепей. Праўда, слова «дэфіцыт» ужо набірае моцы й папулярнасьці. Але ж у Менску няма картак, як у расейскай глыбінцы. Менск «квітнее», «прыгажэе», «расьце»... «Горад-герой» урбанізуецца.

Беларусь — «узорная рэспубліка».

У 1974 годзе Вольга Корбут — чэмпіёнка сьвету.

Пры Гомельскай філярмоніі ствараецца ВІА «Сябры», пры Белдзяржфілярмоніі — ВІА «Верасы» і ансамбаль «Харошкі».

У Радашкавічах адкрываюць завод мастацкай керамікі, а ў Раўбічах — спартовы комплекс.

Адчыняюць менскі Інстытут культуры, вядомы як «Кулёк».

Ставіцца опэра «Тыль Уленшпігель».

Алесь Разанаў выдае паэтычны зборнік «Назаўжды», Раіса Баравікова — свой першы зборнік вершаў «Рамонкавы бераг», Уладзімер Караткевіч піша п'есу «Званы Віцебску», Яўгенія Янішчыц атрымлівае прэмію камсамолу Беларусі за зборнік лірыкі «Дзень вечаровы». Васілю Быкаву даюць дзяржпрэмію за напісаную годам раней аповесьць «Дажыць да сьвітаньня».

Гадуецца «патлатая» моладзь, якая слухае рок-н-рол, і тая, што «мчыцца на аленях» на БАМ...

Застаецца яшчэ пяць гадоў да Аўганістану, дванаццаць — да Чарнобылю, і цэлых дваццаць — да зьяўленьня першага прэзыдэнта.

Севярын Квяткоўскі

Сябры «Блакітнага ліхтару» Валеры Шлыкаў, Лявон Пятроў, Анатоль Рыбікаў, Вінцэсь Мудроў

Наша Ніва 90 гадоў таму

Янка Купала

8 кастрычніка 1909 году

***

Як я полем іду, гнецца колас ка мне.
Зь ім маркотнай душой ціха шэпты вяду;
Колас чуе ўсё ў зачараваным сьне,
Колас гнецца ка мне, як я полем іду.
Як я лугам іду, траўка сьцелецца ў ног,
Абсыпае зь сябе жыўчых росак ваду;
Кветкі жаляцца мне, поўны дзіўных зьнямог.
Траўка сьцелецца ў ног, як я лугам іду.
Як я лесам іду, зважна думкі сную,
Аглядаю сьвятую дубоў грамаду;
Там, як дома, сабе з пушчай песьні пяю, —
Зважна думкі сную, як я лесам іду.
Як я ў хатку ўвайду, мяне штосьці гняце,
Бледны смутак падходзіць-прыносіць нуду;
Ў заплясьнелым кутку цень касьцісты цьвіце.
Мяне штосьці гняце, як я ў хатку ўвайду.

Янук Купала

прыватныя абвесткі

Любага Мядзьведзя віншуем з днём народзінаў! Альця, Марцік

Пазнаёмлюся з разумным мужчынам. Пра сябе: 49/170/60. 220050, Менск, а/с 109

Сэксрэвалюцыянэры Маладэчна! Усеагульная мабілізацыя 7 кастрычніка, чацьвер, а 17-й гадзіне на Цэнтральнай плошчы каля Леніна

Тэрмінова патрабуецца для работы **мэдычная сястра**. Ёсьць ільготы. Тэл.: 235-80-96, з 20.00 да 21.00

Pradaju žanocy paĭkazušok z francuskaha futra, novy, pamier 46, koler karyčnievy, 200 u.a. Tel. u Homieli: 53-89-17

Ты любіш Бога, Бацькаўшчыну, беларускія лясы? Ты — наш брат (сястра). Пазнаёмімся? Тэл.: 271-47-56 (спытаць Алеся)

Набуду **«Нарысы гісторыі Беларусі»** ў 2-х частках. Тэл.: 221-32-27 (пасьля 18)

Zaprašajem homielcaŭ na nabaženstvy. Unijackaja supołka. A/s 124, 246012, Homiel

Весьнік «Слова Нацыі». Радыкальнае ўмяшальніцтва ў млявабягучы працэс дыстрафічнае паталёгіі. Замаўляй! 220086, Менск, а/с 121. (Ад Цябе — капэрта й замова)

Музычныя відэапраграмы замежных выканаўцаў. 960 т. паштовым пераказам. 220107, а/с 150. Фёдараву Дзянісу

Мужчына (39) **шукае працу за мяжой.** Беларускамоўная адукацыя дзяцей каштуе дорага! Тэл.: 8-0163470084, Віктар

У Горадні штопанядзелак і штосераду (вул.К.Маркса 11, 1 паверх) **праходзіць выстава беларускай аўдыёвідэа-кнігапрадукцыі.** З 17 да 20 гадзінаў. Тэл.: 72-11-83

Выказваем **Вользе Анцыповіч шчырую ўдзячнасьць** за яе існаваньне. Прыхільнікі з варожай арганізацыі

Паважаны Вацлаў Хведар! Даўно няма зьвестак! Можа, захварэў ці ажаніўся? Адгукніся! Віншуем са сьвятам! Давідовіч А., Ралавец А.

Віншую **ўсіх Настаўнікаў Беларусі зь іх сьвятам!** Жадаю плённае працы, здароўя, посьпехаў, добрага настрою. Калега

Дарагія мама і тата! Віншуем вас з Днём настаўніка! Жадаю здароўя і бадзёрасьці! Сем'і Давідовічаў

Віншую **любую жоначку Аксану** з Днём настаўніка! Жадаю быць заўсёды прыгожай і шчасьлівай. Твая сям'я

Сп.Бэндыкту Касьцюшку й Вінцэсю Зарэмбу! Не рабіце глупстваў, а знайдзіце НАС у Горадні. Гарадзенскія прыхільнікі газэты «LITVA». 230003, Горадня-3, а/с 62

Зьявіўся новы нумар **газэты «БУНТУЙМА»!** Шукаем радыкальных студэнтаў-карэспандэнтаў у іншых ВНУ. 230003, Горадня-3, а/с 110

Шукаю кантактаў з тымі, хто жадае далучыцца да старадаўняга змаганьня за Беларусь. 220024, а/с 264, Яраміту

Беларусь, Айчына чакае твайго дзеяньня! Будзь з намі, і Мы пераможам! ЗАМ «АГМЕНЬ». 220024, а/с 264

Воля! Помсту трэба падаваць у халодным выглядзе. Старшыня

Газэта прымае таксама абвесткі большым шрыфтам за невялікую плату
— да 20 словаў — 50 000 руб., звыш 20 словаў — 70 000 руб.;
— па-мастацку аформленая аб'ява — 20 000 руб. за 1 кв. см;
— па-мастацку аформленая аб'ява памерам больш за 24 кв. см з улікам кошту арыгінал-макету — ад 40 000 руб. за 1 кв. см.
За аб'яву пра сямейныя падзеі — зьніжка.

Каб замовіць платную прыватную абвестку, трэба пералічыць грошы праз пошту пераводам на наступны разьліковы рахунак: *Рэдакцыя газэты «Наша Ніва», р/р 3012213050010 Ленінскае аддз. «Белбізнэсбанку» г.Менску, код 763.*

На зваротным баку блянка паштовага пераводу ў сэктары «Для пісьмовых паведамленьняў» запісваецца дакладна і чытэльна тэкст абвесткі, тэлефон для сувязі і АБАВЯЗКОВА ДАДАЕЦЦА СКАЗ: «ЗА РЭКЛЯМНЫЯ ПАСЛУГІ».

Рэдакцыя

Віншую Віктара Мухіна з народзінамі!

Хацелі быць птушкамі.
Птушкамі зь вялікімі
белымі крыламі.
Першы ўзьлёт, пачуцьцё свабоды,
і раптам...
Чорная бездань.
Як радасна ўсё згубіць,
нават памерці,
але ўсё ж дыхнуць Свабоды!

Ярына Берасьцейская

ШУКАЕМ НЯНЮ
для дзяўчынкі 1,1 году.
Праца 5 гадзін у дзень.
Аплата пагадзінавая.
Тэл.: 251-95-90

Віншую каханага свайго Лявона Пятровіча Валуя зь пяцідзесяцігодзьдзем.
Ён кожны дзень уздымае над сваёй сядзібай наш бел-чырвона-белы сьцяг свабоды.
Жыве Беларусь — з такімі, як Ён!

Тамара

БЕЛТУР тэл. (017) 216-99-90, 216-99-68, 216-95-31. вул. Альшэўскага 24, п.408

БЕЛАРУСЬ
д/а «Нарач», т/г «Нарач», п. «Спутнік», п. «Журавушка»;
Дом творчасьці пісьменьнікаў *«Іслач» (Ракаў);*
Браслаўскія вазёры: *б/а Слабодка (катэджы), б/а «Дрывяты» (эўракорпус)*

ЛІТВА, ЛАТВІЯ, ЭСТОНІЯ
Візавая падтрымка

ДА ЦЁПЛАГА МОРА!
Турцыя, Кіпр, Сочы, Эгіпэт, ААЭ, Таілянд, Туніс, Гішпанія

ЗША
Адпачынак у Маямі

ПАРЫЖ, ЛЁНДАН
(авія, Менск)

ліц. № 561/3 ад 9.9.1998 г. да 9.9.2000 г. МСТ РБ

ТАА"СОКТАС" **першы пастаўшчык у Беларусі**

СОДЫ КАЛЬЦЫЯНАВАНАЙ

Тэл.: (017) 210 42 19, Тэл./Факс: (017) 229 22 93

НАША НІВА **КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ**

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, Менск, а/с 537

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

паштовая скрынка

Людміле К. зь Менску. *Само па сабе апісаньне вандроўкі цікавае чытачу тады, калі гэта падарожжа пешкі праз Заір, аўтастопам на Алтай або ўплаў зь Бярозаўкі да Горадні. Калі ж гэта адпачынак на Адрыятыцы ці Браславах, то тут зачапіць можа хіба нешта складанейшае за простае апісаньне.*

У беларускай вёсцы ўсё нязвыкла для чалавека расейскай культуры. І імёны («Юзік, Анэля, Чэся, Стэфа, Адальфіна, Яня, Стася, Францішак, Генрых, Мар'ян, Франак»), і тое, што Даўгаўпілс лічаць беларускім горадам Дзьвінскам, і тое, што ніхто не глядзіць «Поля цудаў» і ніхто ніколі ня чуў песьні Барыса Грабеншчыкова пра горад залаты, і тое, што па выразах «голь на выдумку хітра» і «ў жыдкім відзе» могуць пазнаць чалавека, які думае па-расейску, і тое, што жывуць у цагляных двухпавярховых дамах.

Чалавек расейскай культуры думае, што па-беларуску нельга выказаць усё, што гэтая мова недастаткова вобразная і ня мае навуковага лексыкону. Бо яму так мама казала. Таму ён глядзіць на гэтую Беларусь і не прызнае.

Чытачу зь Менску. *Дзяцей Уладзімера Арлова зваць Багдан і Раман, Глёбусавых — Мікола й Ядзьвіга, Вячоркавых — Радаслава, Францішак і Ружана, дачок Ігара Бабкова Ганна і Багдана-Эва, Натальлі Бабінай — Паўліна й Тамара, а слынны беларускі нацыяналіст Янка Станкевіч сваіх дзяцей назваў Вячка, Юрка і Багуш. А вы ўвогуле каталік ці праваслаўны?*

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Адказны сакратар Аляксандра Макавік. Дызайн-макет Лявон Раманчык. Набор Насты Дзядзенкі. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050, Менск, а/с 537. Tel/fax: (017) 227-78-92. E-mail: niva@user.unibel.by Http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. Наклад 2845. 6 палос фарматам А2. Нумар падпісаны ў друк 1:57, 04.10.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 5070. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.